ЯКІ ЁН — НОВЫ ГОД ДРЭЎ? 9

ПРА ГАНАРАРЫ, АДУКАЦЫЮ І ЖОНКУ-БАКСЁРКУ... 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 СТУДЗЕНЯ 2019 г. СУБОТА № 12 (28879)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй ЛАБОВІЧ, першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны:

«Сёння ў людзей вялікі выбар формаў працаўладкавання і пошуку вакансій, у тым ліку з дапамогай інтэрнэту. Удасканалена і работа па садзейнічанні занятасці насельніцтва. У 2018 годзе мы ўпершыню вызначылі пералік тэрыторый з напружанай сітуацыяй на рынку працы і асобных паказчыкаў у галіне садзейнічання занятасці насельніцтва, што дазволіла адрасна вырашаць гэтыя пытанні ў раёнах і гарадах. Перабудавана і работа з наймальнікамі — з акцэнтам на іх патрэбы пры падрыхтоўцы спецыялістаў. Выйграюць усе. Наймальнік атрымлівае кваліфікаваныя кадры, беспрацоўны — новую прафесію і гарантаванае рабочае месца. Сёлета стаіць задача навучыць пад заказ наймальніка 60 % ад усіх беспрацоўных, накіраваных на навучанне. І галоўнае: у сваёй рабоце мы пераходзім ад заяўнага прынцыпу да выяўляльнага».

КАРАТКА

• Прэзідэнт падпісаў Указ № 27 «Аб аплаце працы работнікаў бюджэтных арганізацый». Дакументам з 1 студзеня 2020 года ўстанаўліваецца раўнамерная дыферэнцыяцыя тарыфных ставак (акладаў) работнікаў бюджэтнай сферы за кошт увядзення 18-разраднай тарыфнай сеткі (замест 27-разраднай) з розніцай паміж каэфіцыентамі не менш за 6 %.

• **Аляксандр Лукашэнка павіншаваў работнікаў і ветэранаў органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях з прафесійным святам — Днём ратавальніка і 20-годдзем стварэння МНС Беларусі.**

• Зняць аўтамабіль з уліку з 21 студзеня можна будзе ў любым рэгістрацыйным падраздзяленні.



ISSN 1990 - 763X

Вытокі малой радзімы

Каля бароўскіх крыніц

Лепельшчына славіцца сваімі азёрамі: тэрыторыю раёна абмываюць амаль сто сорак вялікіх і малых азёр. Нездарма гэты край называюць пачаткам Паазер'я. А яшчэ дзясятак рэк і ручаёў, сотні крыніц... Многія крыніцы ахоўваюцца — яны помнікі прыроды, да іх арганізоўваюцца паломніцтвы, пракладваюць турыстычныя маршруты. Вядомыя з мінулага крыніцы «На крыжах», «Добрая вада», «Пятніцкая крыніца», «Бароўскія крыніцы» і іншыя вытокі па-ранейшаму вабяць безліч ахвотных наталіцца гаючай вадзіцай.

Лепельскі раён можа пахваліцца і сваімі духоўнымі вытокамі. Мясцовы цэнтр рамёстваў з поспехам адраджае ткацтва, вышыўку, пляценне з лазы і бярэсты, ганчарства і выраб свістулек, разьбу па дрэве. Гонар цэнтра — традыцыйны лепельскі строй — народнае адзенне дзевятнаццатага стагоддзя. Яго стварыла — аднавіла, распрацавала, вызначыла рэгіянальныя і сезонныя асаблівасці — малады метадыст-майстар Наталля ПЯТРЫШЧА, выпускніца Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта.

— Традыцыйнае зімовае адзенне, у якое мы апрануты, называецца «світа» — так хадзілі нашыя продкі, — тлумачыць Наталля Пятрышча, якая для фотаздымкаў стала мадэллю.

Мы прыйшлі ў крынічны куток паблізу вёскі Бароўка — тут некалькі крыніц утвараюць сапраўдную рэчку. Разам з Наталляй мужчынскі строй прэзентаваў Леанід ЗАБАБУРА, работнік раённага Дома культуры, удзельнік гурта «Кругаверць» (гурт прапагандуе побытавыя танцы Паазер'я).

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Вышэйшая школа

Патрабуюцца аналітыкі

Як задаволіць кадравы голад у сферы IT?

Ці могуць беларускія ВНУ задаволіць патрэбы IT-кампаній у кадрах? Якімі ведамі і кампетэнцыямі павінны валодаць выпускнікі, якія мараць трапіць у Парк высокіх тэхналогій? Каго будуць рады бачыць у сябе наймальнікі? Як палепшыць практычны складнік падрыхтоўкі будучых спецыялістаў? Адказы на гэтыя пытанні на паверхні не ляжаць. Амаль штогод беларускія ВНУ павялічваюць наборы на IT-спецыяльнасці. Толькі за пяць апошніх гадоў у сферы вышэйшай адукацыі адкрылася 30 новых спецыяльнасцей IT-профілю. Таксама актыўна развіваецца ў краіне і дыстанцыйная форма атрымання адукацыі. Але кадравы голад у сферы IT па-ранейшаму захоўваецца. Работадаўцы кажуць, што быць добрым праграмістам і ўмець пісаць код для эфектыўнай работы ўжо недастаткова. Не менш важна быць гнуткім і камунікабельным, умець працаваць у камандзе. «Мяккія навыкі» (soft skills) у вялікай ступені ўплываюць на развіццё кар'еры.

Змяненні ў змесце і форме

— Па сутнасці, кадзіроўшчыкі і тэсціроўшчыкі — гэта значыць выпускнікі, якія валодаюць ніжнім і сярэднім узроўнем кампетэнцый, — адыходзяць на другі план. Трансфармацыя IT-галіны ў бок высокатэхналагічных прадуктовых распрацовак і пашырэнне магчымасцяў штучнага інтэлекту робяць запатрабаванымі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, якія валодаюць фундаментальнымі навуковымі ведамі. Сёння патрабуюцца аналітыкі, якія рыхтуюцца на нашай міжпрадметнай універсітэцкай кухні, — падкрэслівае **рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй КАРОЛЬ.**

СТАР. 4

(Не)тыповыя беларусы

«ГЭТА БЫЎ НАШ З УНУКАМ САКРЭТ»

63-гадовая доктар з Ганцавічаў — пра тое, як скокнула з парашутам

Часам, бывае, нас моцна здзіўляюць калегі або знаёмыя, здзейсніўшы нешта такое, чаго ад іх ну ніяк не чакаеш. Як нядаўна ўразіла многіх доктар з Ганцавіцкай цэнтральнай раённай бальніцы Таццяна Буйніч, якая ў свае 63 гады ўпершыню ў жыцці рызыкнула скокнуць з парашутам з вышыні 3,5 тысячы метраў. А пасля гэтага яшчэ заняла першае месца ў конкурсе «Самы лепшы дзень 2018»! Відэа са скачком Таццяны Васільеўны ўжо разляцелася па беларускім інтэрнэце і зрабіла фурор. «Звязда» вырашыла пагутарыць з новай зоркай байнэту.

— Таццяна Васільеўна, раскажыце, як вам прыйшла ў галаву такая ідэя?

— Я наогул чалавек па жыцці рызыковы. Успамінаю сваё дзяцінства: мне трэба было абавязкова залезці кудысьці высока, скочыць... Ці калі была маладая і ўжо працавала: бывала, паступіць выклік — роды за тры кіламетры і крывацёк у парадзіхі (Таццяна Буйніч — акушэр-гінеколаг. — **Аўт.**)... «Хуткай» на месцы няма: раён вялікі, машына на іншым выкліку... І я адна ў дзве гадзіны ночы бягу да гэтай парадзіхі і нічога не баюся!

СТАР. 5

МЫ ПАВІННЫ АБАРАНІЦЬ СВОЙ СУВЕРЭНІТЭТ І НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

Беларусь гатова будаваць цёплыя адносіны з усімі суседзямі, але жадае жыць «ва ўласнай кватэры»

Такую заяву зрабіў беларускі лідар на сустрэчы з цяперашнім і былымі міністрамі замежных спраў нашай краіны.

Учора, напярэдадні 100-годдзя беларускай дыпламатычнай службы, Аляксандр Лукашэнка прыняў у Палацы Незалежнасці міністраў замежных спраў, якія ў розны час узначальвалі МЗС Рэспублікі Беларусь. Сваімі думкамі наконт шляхоў развіцця знешняй палітыкі падзяліліся Пётр Краўчанка (узначальваў знешнепалітычнае ведамства ў 1991—1994), Уладзімір Сянько (1994—1997), Іван Антановіч (1997—1998), Урал Латыпаў (1998—2000), Міхаіл Хвастоў (2000—2003), Сяргей Мартынаў (2003—2012) і, вядома, цяперашні міністр Уладзімір Макей. На сустрэчы ўдзельнікі абмеркавалі ролю і месца Беларусі ў сусветнай супольнасці, а таксама тое, куды рухаецца наша краіна. Не абышлося без размовы аб адносінах краіны з асобнымі дзяржавамі ў прыватнасці.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сапраўды рады гэтай сустрэчы, і дадаў, што такое мерапрыемства магло б стаць добрай традыцыяй. Ён нагадаў, што гэтая сустрэча праходзіць напярэдадні 100-годдзя беларускай дыпламатычнай службы, што з'яўляецца «прызнаннем вашых заслуг».

«Вы — людзі дасведчаныя, і збоку вы назіраеце ўсе працэсы, збоку, кажуць, лепш відаць. Гэта сапраўды так: калі знаходзішся ў гэтым катле, не заўсёды заўважаеш нюансы, дэталі», — сказаў ён.

Наш адказ на правакацыі

Прэзідэнт нагадаў прысутным, што апошнім часам яго і міністра замежных спраў абвінавачваюць нібыта не ў тым курсе, які Беларусь праводзіць у знешняй палітыцы. Паводле яго слоў, з аднаго боку, маецца меркаванне, што наша краіна — залішне празаходняя, з другога боку, нас крытыкуюць за залішнюю прыхільнасць да Расіі.

«Што мяне трывожыць. Справа не ў манеўрах падатковых — перажывём мы іх. Мне не зусім зразумелая — я думаю, мне давядзецца задаць пытанне кіраўніцтву Расіі — такая атака на Беларусь у СМІ, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Насцярожвае тое, што яны спрабуюць нас сутыкнуць з расіянамі».

Беларускі лідар прывёў у прыклад навіну з інтэрнэту — канфлікт у метро, які быў паднесены ў такім ключы, быццам у Беларусі здзяйсняюцца нападкі на рускіх. Ён дадаў, што калі прачытаў гэта, то даручыў неадкладна разабрацца ў сітуацыі. Аказалася, што расіян там не было, гэта быў канфлікт двух беларусаў, які быў хутка зняты на відэа і скінуты ў інтэрнэт. І прычым тут рускі народ?

«Нас не ўдасца сутыкнуць — беларусаў з расіянамі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Не толькі з рускімі, наогул з расіянамі. Гэта не той шлях, каб у Расіі камусьці атрымаць дывідэнды ад гэтага. Вы ведаеце, якія там патрэбныя дывідэнды. Не атрымаецца».

«Няўжо камусьці ў Расіі Украіны не хапае? Няўжо трэба абавязкова вось стварыць праблему на роўным месцы? Няма ў вас магчымасці кампенсаваць нам гэтыя страты ад падатковага манеўру — ну і Гасподзь з вамі. Мы ж у вас не адбіраем тавар», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Беларускі лідар адзначыў, што нагадваў Уладзіміру Пуціну аб тым, хто бурыў нафтавыя і газавыя свідравіны на тэрыторыі Расіі ў савецкія часы. Ён таксама падкрэсліў: мы не просім грошай, мы ў стане іх зарабіць. Кіраўнік дзяржавы заклікаў не баяцца канкурэнцыі на агульным рынку і не ставіць палкі ў колы.

Выбраць лепшыя ўмовы для роўнасці

Таксама Прэзідэнт нагадаў, што пры падпісанні ўсіх дагавораў Беларусь патрабавала роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання і для людзей. «Дзе яны (умовы. — **«Зв.»**) зараз?» — пацікавіўся ён. — Саюз — калі ласка, аб'яднанне — калі ласка, але толькі гэта павінны людзі вырашыць, а не мы. Мы не адмаўляемся ні ад аднаго тэзіса».

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што калі хтосьці яму пачынае гаварыць пра аб'яднанне, то, напрыклад, закранаюць тэму агульнай валюты. «Мы не супраць, але гэта павінна быць агульная валюта, а не валюта Цэнтрабанка Расіі. Гэта павінен быць эмісійны цэнтр — і няважна, дзе ён размяшчаецца; у Казані або ў Маскве, Смаленску або Мінску. Гэта павінен быць эмісійны цэнтр, створаны на роўных умовах. Калі вы прыводзіце прыклад ЕС — добра, на прынцыпах ЕС, але каб умовы былі роўныя і падыходы», — зноў падкрэсліў ён.

Таксама Расія хоча ўніфікаваць падатковую і мытную палітыку — беларускі лідар пагадзіўся, аднак гэта павінна быць зроблена на найлепшых умовах. Гэта значыць, калі ў Беларусі сістэма лепшая — за аснову браць яе, у расіян лепшая — бяром яе. Але гэта не павінна быць зроблена па прынцыпе «мы вялікія — вы малыя, рабіце так, як у нас».

Чаму гэта ўсё адбываецца? На гэтае пытанне Прэзідэнт даў адказ. «Ніякіх тут міждзяржаўных і міжнародных адносін няма. Усё ў прыватнасцях, усё ў асобах, усё ў тым, што камусьці не падабаецца курс, які Беларусь праводзіць, — нават не знешнепалітычны, а тая эканоміка, якую мы будуем, той сацыяльны ўклад, які мы ствараем на прынцыпах, перш за ўсё, справядлівасці», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Ён пераканаў: з-за гэтага і пачынаюцца нападкі на нашу краіну. «Як мы павінны на гэта рэагаваць? Спакойна і мэтанакіравана. Мы павінны абараніць свой суверэнітэт і незалежнасць. Мы не супраць расіян, не супраць палякаў, літоўцаў. Мы хочам быць у любым саюзе, але мы хочам жыць ва ўласнай кватэры. У нас гэтая кватэра ёсць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Беларускі лідар чарговы раз звярнуў увагу, што суседзяў, якія б яны ні былі, не выбіраюць. І Беларусь гатова з усімі будаваць добрыя, цёплыя, узаемавыгадныя адносіны — нават з Літвой, якая палітызуе любое пытанне.

«Як бы ў нас ні складваліся адносіны з Расіяй, мы ніколі не дазволім, каб у нас у Беларусі, на гэтай святой зямлі, дрэнна ставіліся да расіян. І калі камусьці там хочацца сутыкнуць нас — не атрымаецца. Мы ведаем, як на гэта рэагаваць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, сёння не толькі з дапамогай тэлебачання, але і інтэрнэту можна данесці да рускага чалавека пункт гледжання Беларусі. Прэзідэнт адзначыў, што сёння ў кіраўніцтве Расіі некаторыя асобы занялі пазіцыю ціску — нават на кіраўніка расійскай дзяржавы. Тым не менш па сустрэчах з Уладзімірам Пуціным беларускі лідар выразна ўбачыў яго намер: ні ў якім разе не разрываць адносіны. Гэта вельмі нявыгадна, гэта будзе стратна для абодвух бакоў.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што сёння расійскія сродкі масавай інфармацыі могуць сфальсіфікаваць інфармацыю — у гэтым заключаецца небяспека. Пры гэтым ён папярэдзіў: калі ж будуць факты агрэсіі ў Беларусі ў адносінах да расіян, то рэакцыя будзе вельмі жорсткая. Праваахоўныя органы атрымалі ўказанне спыняць такія рэчы і разбірацца.

Украінскае пытанне адмаўляюцца вырашаць

Прэзідэнт звярнуў увагу, што за гады незалежнасці краіна дамаглася прыкметных поспехаў на міжнароднай арэне, стаўшы ўдзельнікам многіх інтэграцыйных праектаў. Пашырана кола замежных партнёраў і саюзнікаў. Адкрыты перспектыўныя рынкі — па хуткасці не зусім так, як хацелася б, але тым не менш.

Беларуская дыпламатыя выйшла на якасна новы ўзровень. На мінскай перагаворнай пляцоўцы абмяркоўваюцца вельмі складаныя рэгіянальныя і глабальныя праблемы. Пры гэтым беларускі лідар заклікаў не акцэнтаваць увагу на месцы правядзення перагавораў, паколькі здарылася «бяда ў нашых родных людзей». Дарэчы, ініцыятарам сустрэчы ў Мінску па Украіне была канцлер Ангела Меркель, а прапанову перадаў Уладзімір Пуцін на перагаворах у Сочы.

«Мяне турбуе тое, што адбываецца там, і тое, што ўжо ўплывае на нас», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Сур'ёзныя асцярогі выклікае прыток зброі праз мяжу, пра што Прэзідэнт гаварыў неаднойчы. Ён зноў успомніў пра больш чым сотню тысяч бежанцаў з Украіны, якія атрымалі роўныя правы з беларусамі. Будзе дрэнна, калі гэты канфлікт зацягнецца, упэўнены Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама распавёў, што апошнім часам Беларусь абвінавачваюць у тым, што нібыта мы запраўляем украінскія танкі дызельным палівам. Ён даручыў разабрацца ў сітуацыі, на што было даложана, што паліва там расійскае. Пры гэтым аб'ёмы паставак бензіну і дызеля толькі нарошчваюцца.

Беларускі лідар зноў заявіў, што ўкраінскі канфлікт — гэта падарунак для Захаду.

Нядаўна на Мюнхенскай канферэнцыі амерыканцы сказалі: мы хочам міру ва Украіне, хочам, каб у Еўропе быў парадак. Наш Прэзідэнт прапанаваў сабрацца ў рамках АБСЕ, абмеркаваць праблему. У адказ прагучала «не». «У кожнага свае мэты, — канстатаваў ён. — Давайце выйдзем на нейкія Хельсінкі-2, калі на тое пайшло».

Пры гэтым з Еўропы паступаюць адназначныя намёкі: цяпер гэтага рабіць не трэба, значыць, ім гэта і не трэба. Неабходна тушыць гэты пажар, паколькі далей будзе горш, але пакуль рашэнняў няма. «Усе хочуць пагрэць рукі на Украіне. І вось гэты пажар, які там палае і невядома чым скончыцца, не павінен перакінуцца на Беларусь. Таму нам трэба тысячу разоў быць больш асцярожнымі, больш акуратнымі і ні ў якім разе не дапусціць унутранай дэстабілізацыі ў краіне. Падобна на тое, што пераважная большасць нашага насельніцтва і нават пераважная большасць нашай так званай апазіцыі разумеюць, што гэта можа скончыцца вельмі дрэнна», — сказаў Лукашэнка.

Адкрыты да меркавання кожнага

Што датычыцца МЗС, то кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што аўтарытэт і ролю міністэрства пастаянна падтрымліваюць — усталявалі Дзень дыпламатычнага работніка, увялі геральдычныя сімвалы. Акрамя таго, па-за Беларуссю цікавяцца меркаваннем нашага Міністэрства замежных спраў, запрашаюць на канферэнцыі. На думку беларускага лідара, гэта сведчыць аб тым, што Беларусь пачынае адыгрываць усё большую ролю на міжнароднай арэне. «Таму ў гэтай сітуацыі мяняць знешнепалітычны курс я падстаў не бачу. Можа быць, вы бачыце нейкія нюансы, якіх я не ведаю. Можа, прычыны нейкія ёсць для таго, каб дзе-небудзь што-небудзь карэкціраваць. Я чакаю ад вас, каб вы гэта сёння выказалі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён запрасіў усіх прысутных да гутаркі, каб адказаць на пытанні, як дзейнічаць далей і выбудоўваць збалансаваную знешнюю палітыку.

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей падкрэсліў, што Аляксандр Лукашэнка рэгулярна цікавіцца меркаваннем папярэднікаў міністра адносна тых ці іншых крокаў нашай краіны. Паводле яго слоў, гэта знакавая сустрэча з пункту гледжання пераемнасці.

«Вельмі важна ўлічваць тое, што было напрацавана, і абапірацца на тое, што напрацавана папярэднікамі», — сказаў ён.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

На «перадавой» лініі

Работнікам дыпламатычнай службы Рэспублікі Беларусь

Паважаныя супрацоўнікі Міністэрства замежных спраў, замежных установаў Рэспублікі Беларусь, ветэраны дыпламатычнай службы!

Стагоддзе беларускай дыпламатычнай службы, пачатак якой быў пакладзены ў студзені 1919 года, — важная гістарычная вяха для нашай краіны.

У гэты перыяд адбылося мноства знакавых падзей. Самыя яркія з іх — падпісанне ў 1945 годзе Статута ААН і ўваходжанне Беларусі ў склад заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Развіццё нацыянальнай дыпламатыі непарыўна звязана са станаўленнем беларускай дзяржаўнасці, рашэннем задач па забеспячэнні раўнапраўнай інтэграцыі нашай краіны ў сусветную палітычную, эканамічную, навуковую, культурную і інфармацыйную прастору.

За гады незалежнасці Рэспубліка Беларусь дамаглася прыкметных дасягненняў на сусветнай арэне: захавала і ўмацавала традыцыйныя сувязі, пашырыла кола замежных партнёраў і саюзнікаў, стала ўдзельнікам інтэграцыйных праектаў, многіх аб'яднальных міжнародных ініцыятыў, адкрыла і асвоіла новыя перспектыўныя рынкі, зарэкамендавала сябе як донар рэгіянальнай бяспекі.

У гэтых дасягненнях — немалая заслуга дыпламатаў. Сваёй напружанай працай, высокім прафесіяналізмам і адказным падыходам да справы вы не раз пацвярджалі здольнасць эфектыўна абараняць законныя інтарэсы Беларусі, правы і свабоды яе грамадзян за мяжой.

Перакананы, што Міністэрства замежных спраў і надалей застанецца на «перадавой» барацьбы за суверэнітэт і рэальную незалежнасць, павышэнне ролі нашай дзяржавы ў свеце.

Віншую супрацоўнікаў міністэрства і замежных установаў Рэспублікі Беларусь са знамянальным юбілеем. Асаблівыя словы ўдзячнасці адрасую ветэранам дыпламатычнай службы, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай дыпламатыі, з'яўляючыся прыкладам служэння Айчыне.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і поспехаў у вашай дзейнасці на карысць Радзімы.

З павагай,
Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

ПРАМАЯ ЛІНІЯ

Усё, што вы хацелі спытаць пра жыллёвае заканадаўства

Якія падвохі могуць чакаць пры куплі кватэры ў растэрміноўку? Ці падлягае падаткаабкладанню падараная кватэра? Ці можна аспрэчыць дагавор дарэння? Як падзяліць асабовыя рахункі? Пры якіх умовах можна выселіць уласніка з кватэры?

Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на прамой тэлефоннай лініі гасцям нашай рэдакцыі — **адвакатам спецыялізаванай юрыдычнай кансультацыі № 3 па прававым забеспячэнні здзелак з нерухомасцю Мінскай гарадской калегіі адвакатаў Святлане КАСЦЕВІЧ і Сняжане БАХОРЫНАЙ.**

Прамая лінія пройдзе **23 студзеня з 11 да 13 гадзін.** Наш тэлефон **8 (017) 287-18-71.**

Папярэднія пытанні можаце задаваць **21 і 22 студзеня па тэлефоне 8 (017) 287-18-29** у працоўны час. Або можаце даслаць пытанні (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by ці па пошце: вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск.

У рэгіёнах

АДКАЗНАСЦЬ ВЯЛІКАЯ

Мясцовай уладзе неабходна арыентавацца на патрэбы людзей і прынцып справядлівасці

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з кіраўніцтвам Салігорскага раёна і працоўным калектывам «Беларуськалій». Сустрэча са старшынёй райвыканкама Алегам Паскробкам і яго камандай дапамагла прааналізаваць выкананне задач, якія ставілі перад рэгіёнам.

Фота газеты «Шахцёр».

«Парадавала, што праблемных прадпрыемстваў, на якія варта было б звярнуць асаблівую ўвагу на рэспубліканскім узроўні, як мне дакладваў старшыня райвыканкама, няма. Пытанні, якія ўзнікаюць, вырашаюцца на мясцовым узроўні. І гэта правільна. Менавіта ад працы старшынь гар- і райвыканкамаў залежыць грамадска-палітычнае становішча, сацыяльна-эканамічнае развіццё рэгіёна. Калі гэта прадпрыемствы камунальнай або рэспубліканскай формы ўласнасці, усё роўна з іх кіраўнікамі даводзіцца мець справу ўладам на месцах. Таму што на ўсіх гэтых прадпрыемствах працуюць людзі, якія жывуць у вашых рэгіёнах. І яны павінны разумець, што тут ім забяспечаны заробак, сацыяльная абарона. Адхіляцца ад праблем нельга. Вы гаспадары на сваёй тэрыторыі, знаходзіцеся на перадавой. І адказнасць вялікая», — сказала Наталля Качанава, звяртаючыся да раённых і гарадскіх чыноўнікаў.

На парадку дня застаюцца цэны, занятасць і заробкі. «Неабгрунтаванага росту цэн у гандлёвых сетках быць не павінна, тым больш, як я паглядзела, канкурэнцыя ў вас тут дастаткова высокая», — падкрэсліла яна. Таксама кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта заўважыла, што, акрамя «Беларуськалія», павінны развівацца і іншыя прадпрыемствы, каб даваць працоўныя месцы. Да таго ж неабходна ствараць умовы для развіцця жаночай працы і прадпрымальніцтва, асаблівую ўвагу ўдзяляць моладзі. Што датычыцца камісій па садзейнічанні занятасці, Наталля Качанава папрасіла не дапускаць памылак: «Гэтымі пытаннямі павінны займацца самыя кампетэнтныя людзі. Для гэтага і створаны камісіі. У вас 900 вакансій і 300 беспрацоўных. Унікайце ў сітуацыі людзей і дапамагайце».

Пазней яна сустрэлася з працоўным калектывам «Беларуськалія». Адзіны дзень інфармавання быў прысвечаны Году малой радзімы. Наталля Качанава закранула тэмы забеспячэння жыллём шматдзетных сямей, павышэння заробкаў у бюджэтнай сферы, роўнасці ўсіх грамадзян перад законам і іншыя. Пасля гэтага адказала на пытанні прысутных.

Паводле БелТА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кітай паабяцаў «не станавіцца ЗША»

Як заявіў кіраўнік МЗС КНР Ван І ў інтэрв'ю газеце «Жэньмінь жыбаа», здагадкі і заявы пра тое, што Кітай мае намер стаць «другімі ЗША» ці замяніць Вашынгтон на сцэне сусветнай палітыкі, вельмі памылковыя. Заява была зроблена з нагоды 40-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін дзвюх дзяржаў. Як адзначыў дыпламат, у Вашынгтона ёсць вялікія падазрэнні наконт амбіцый Кітая. «Яны лічаць, што моцная краіна абавязкова павінна быць узурпатарам, што ў будучыні Кітай абавязкова кіне выклік ці заменіць ЗША, гэта вельмі сур'ёзнае памылковае стратэгічнае меркаванне», — лічыць Ван І. Дыпламат падкрэсліў, што Пекін хацеў бы будаваць адносіны з усімі краінамі без выключэння на аснове ўзаемнай выгады і «пазітыўнага саперніцтва». «Кітайска-амерыканскія адносіны, заснаваныя на каардынацыі, супрацоўніцтве і стабільнасці, прынясуць больш карысці людзям дзвюх краін і народаў свету на новым адпраўным пункце», — рэзюмаваў дыпламат. Нагадаем, раней Пекін выступіў з крытыкай ЗША за пагрозы на адрас нямецкіх кампаній, якія ўдзельнічаюць у праекце «Паўночны паток-2». КНР заклікала даць краінам самастойна прымаць рашэнне аб супрацоўніцтве і падтрымцы кантактаў з кампаніямі іншых краін.

У Калумбіі ўзарвалі паліцэйскую акадэмію: больш як 20 загінулых, дзясяткі параненых

У сталіцы Калумбіі Багаце аўтамабіль, начынены ўзрыўчаткай, урэзаўся ў сцяну будынка нацыянальнай паліцэйскай акадэміі. Пачуўся выбух, загінула больш чым 20 чалавек, каля 90 параненыя. Уладны кваліфікавалі гэтае здарэнне як тэракт. Асоба тэрарыста ўстаноўлена: гэта 56-гадовы Хасэ Альдэмар Рохас Радрыгес, паведамляе газета El Tiempo. У яго машыне, якую ён накіраваў на будынак, як мяркуецца, знаходзілася 80 кг выбуховага рэчыва пенталіту. Сам выбух адбыўся ў 9.30. Перад тэрактам у акадэміі праходзіла ўрачыстая цырымонія павышэння ў пасадзе супрацоўнікаў калумбійскай паліцыі і прыняцця ў яе шэрагі курсантаў. Праз некалькі хвілін пасля заканчэння мерапрыемства да запаснога КПП пад'ехаў пазадарожнік Nissan 1993 года выпуску. Службовы сабака падаў знак, што ў машыне ёсць нешта падазронае, ахоўнік хацеў праверыць, але кіроўца націснуў на педаль газу і заехаў на тэрыторыю школы. Выбух быў такой сілы, што ў некаторых суседніх дамах выбіла вокны. Кіроўца і некалькі супрацоўнікаў акадэміі загінулі на месцы. Прэзідэнт Калумбіі Іван Дуке, які прыбыў на месца здарэння, назваў інцыдэнт «вар'яцкім тэрактам». У звароце да нацыі ён паведаміў, што распарадзіўся ўзмацніць кантроль на межах краіны, каб арганізатары нападу не змаглі схавацца. У Калумбіі абвешчана трохдзённая агульнанацыянальная жалоба.

Больш за сем тысяч тон касмічнага смецця круціцца вакол Зямлі

ЗША, Расія і Кітай з'яўляюцца лідарамі ў забруджванні калязямной прасторы касмічным смеццем. Пра гэта гаворыцца ў апублікаваных тэзісах аднаго з артыкулаў, падрыхтаваных да Каралёўскіх чытанняў супрацоўнікамі Маскоўскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Баўмана, на якія спасылаецца «Інтэрфакс». Маса смецця на арбіце пры гэтым працягвае расці: за апошнія тры гады яна павялічвалася кожны год прыкладна на 100 тон, або каля 2 працэнтаў. Больш за ўсё касмічнага смецця ўтвараецца з-за разбурэння і сутыкнення арбітальных апаратаў. Акрамя таго, арбіту засмечваюць адпрацаваныя ступені і разгонныя блокі ракетаносьбітаў, ужо нядзейныя спадарожнікі, фрагменты, якія адарваліся пры запусках. Па звестках на 2017 год, на калязямной арбіце знаходзіцца каля 18 тысяч аб'ектаў памерам больш за 10 сантыметраў, у тым ліку 1200 спадарожнікаў, 750 тысяч «лятучых куль» (памер кожнай «кулі» — каля сантыметра) і каля 150 мільёнаў фрагментаў памерам менш за міліметр. Навукоўцы адзначаюць, што калі ў калязямной прасторы абломкі рана ці позна тармозяцца, падаюць і большай часткай згараюць у атмасферы, то на геастацыянарнай арбіце яны могуць круціцца вечна.

МАХЛЯРСТВА З КВАТЭРАМІ І НЕ ТОЛЬКІ...

У Мінску завершана расследаванне крымінальнай справы аб двайным продажы кватэр. Навар — 2 млн рублёў

Як паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па г. Мінску, 51-гадовы кіраўнік ТДА «Капінбуд» завалодаў грашовымі сродкамі дольшчыкаў, заключыўшы фіктыўныя дагаворы куплі-продажу адных і тых жа аб'ектаў будаўніцтва. Таксама ён заключаў дагаворы закладу, пазыкі, аб выкананні работ па паляпшэнні эксплуатацыйных характарыстык і шэрагу дадатковых пагадненняў да іх. Усяго такім спосабам ён атрымаў больш за 2 мільёны рублёў. У рамках крымінальнай справы пацярпелымі прызнаны 28 грамадзян.

Следствам установлена, што абвінавачаны, з'яўляючыся фактычным кіраўніком юрыдычнай асобы, у перыяд са студзеня 2013 года да сакавіка 2018 года ўхіліўся ад выплаты падаткаў, прычыніўшы ўрон дзяржаве на агульную суму больш за 395 тысяч рублёў.

Акрамя таго, абвінавачаны арганізаваў рэгістрацыю падстаўной асобы ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і ў перыяд са студзеня 2013 года да 2016 года шляхам афармлення фіктыўных здзелак з суб'ектамі гаспадарання рэальнага сектара эканомікі ўхіліўся ад выплаты падаткаў на агульную суму больш за 240 тысяч рублёў.

Следчыя дапыталі больш за сотню сведак. Канфіскавана і вывучана 30 тамоў дакументацыі аб фінансава-гаспадарчай дзейнасці таварыства. Накладзены арышт на маёмасць агульным коштам больш за 4 мільёны рублёў.

Дзеянні службовай асобы кваліфікаваныя па ч. 4 арт. 209 (махлярства ў асабліва буйным памеры), ч. 2 арт. 243 (ухіленне ад выплаты сум падаткаў у асабліва буйным памеры), ч. 2 арт. 234 (ілжэпрадпрымальніцтва) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Да яго прыменена мера затрымання ў выглядзе заключэння пад варту.

Сяргей КУЛАКОЎ.

На слыху

Білет у спартыўны люты

Учора пачаўся продаж абанементаў на адкрыты чэмпіянат Еўропы па біятлоне і «Гонку легенд».

Абанемент на ўсе віды спаборніцтваў чэмпіянату каштуе 70 рублёў. Білеты на асобныя дні паступяць у продаж пазней. Іх можна набыць на Ticketpro.by або ў білетных касах. «Гонка легенд» з удзелам чатырохразовай алімпійскай чэмпіёнкі Дар'і Домрачавай адбудзецца ў спарткомплексе «Раўбічы» 18 лютага. Чэмпіянат Еўропы па біятлоне будзе праходзіць тут з 20 па 24 лютага.

Расклад спаборніцтваў:

18 лютага
«Гонка легенд»
Мас-старт
Змешаная эстафета

20 лютага
16.00 Індывідуальная гонка (мужчыны)
19.30 Індывідуальная гонка (жанчыны)

21 лютага
16.00 Адзіночная змешаная эстафета
19.00 Змешаная эстафета

23 лютага
11.00 Спрынт (мужчыны)
14.00 Спрынт (жанчыны)

24 лютага
11.00 Гонка праследавання (мужчыны)
13.00 Гонка праследавання (жанчыны)

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

У Гродне адкрылася новая салдацкая лазня

Ваенныя гарадкі ў Беларусі паступова ўдасканальваюцца і мадэрнізуюцца.

Робіцца гэта паступова, што можна прасачыць на прыкладзе 6-й асобнай гвардзейскай механізаванай брыгады. Летась у новы двухпавярховы будынак з сучасным абсталяваннем пераехала медыцынская рота. А ўчора на тэрыторыі гарадка адкрылася новая салдацкая лазня. Раней ваеннаслужачыя хадзілі памыцца ў лазні на тэрыторыі горада. Было гэта не зусім зручна. Цяпер жа адначасова лазня можа прыняць да трыццаці чалавек.

— Ідзе планамерная работа па прывядзенні ваенных аб'ектаў у ідэальны стан. Учора зроблены чарговы крок у гэтым кірунку, — адзначыў **міністр абароны Андрэй РАЎКОЎ.**

— На тэрыторыі вобласці дыслакуецца шэраг падраздзяленняў Заходняга аператыўнага камандавання, — расказаў **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ.** — І тут служаць пераважна хлопцы з Гродзенскай вобласці. Таму мы пастаянна імкнёмся ствараць нармальныя бытавыя ўмовы для ваеннаслужачых.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

З надзеяй на лепшае

Трэці тыдзень у ваколіцах вёскі Камароўка працягваюцца пошукі 26-гадовага Мікалая Бяцені, які знік у навагоднюю ноч.

Жыхар вёскі Дамачава Брэсцкага раёна адзначаў свята ў сваёй сястры ў вёсцы Камароўка. Потым ён працягваў адпачываць на дыскатэцы ў сельскім ДК, затым зайшоў у дом, дзе сустракала Новы год моладзь. Апошні раз ён выходзіў на сувязь з сястрой у 6.15 раніцы 1 студзеня, а потым нібыта пайшоў дадому, але больш яго ніхто не бачыў. Спачатку сваякі шукалі хлопца самі з дапамогай сяброў і знаёмых, а на наступны дзень звярнуліся ў міліцыю. Адразу да пошукаў прыступіла больш за 50 чалавек — супрацоўнікаў міліцыі, вайскоўцаў, супрацоўнікаў МНС. Пазней сталі прыбываць валанцёры з Брэсцкага і суседніх раёнаў. Следчым камітэтам узбуджана крымінальная справа, затрыманы тры чалавекі, які былі ў адной кампаніі з Мікалаем той ноччу.

Як паведаміла карэспандэнту газеты **старшыня Тамашоўскага сельскага Савета Алена БУРАК**, цяпер у пошуках штодня задзейнічана каля двухсот чалавек. Абследуюцца лясныя масівы, закінутыя будынкі навакольных вёсак, падвальныя і іншыя памяшканні. Алена Іванаўна выказала шчырыя шкадаванні наконт інфармацыі, якая з'яўляецца і ў сацсетках, і ў СМІ. Пішуць, што маладога чалавека білі ледзь не 15 альбо 20 чалавек, а потым схавалі цела. Але ж ніхто нічога не ведае. Праверкі, якія праводзяць праваахоўнікі, пакуль нічога не пацвярджаюць.

Вяскоўцы трывожацца, што хлопец мог трапіць у балота. Балоцістыя мясціны тут небяспечныя. Ужо ў ходзе пошукаў давялося ратаваць вадалаза і валанцёра, якія трапілі ў багну. Да пошуку прыцягвалі экстрасэнсаў. Але яны супярэчаць адно аднаму і вядуць пошукавікаў у розныя бакі.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

«П'яная» язда ў Полацку

Шакавальнае відэа з'явілася ў сеціве. Легкавы аўтамабіль улятае ў натоўп людзей і літаральна раскідвае іх.

Як паведамілі ў ДАІ Віцебска, аварыя адбылася ў Полацку каля 17 гадзін на прыпынку «Шкловалакно». Падчас пасадкі пасажыраў у аўтобус у іх заехаў Citroen. Па шчаслівай выпадковасці ніхто не пацярпеў. Кіроўца з месца ДТЗ уцёк, машыну знайшлі кінутай. За кіламетр ад яе па месцы жыхарства затрымалі ўцекача, 31-гадовы мужчына быў п'яны. Супрацоўнікі ДАІ склалі на яго 7 адміністрацыйных пратаколаў. Як высветлілася, раней палачанін ужо пазбаўляўся правоў за кіраванне аўто ў стане алкагольнага ап'янення.

Сяргей КУЛАКОЎ.

Суд Еўразійскага эканамічнага саюза выказвае глыбокія і шчырыя спачуванні родным і блізкім у сувязі з заўчаснай стратай — смерцю Васіля Мікалаевіча СУДАСА.

У гэты журботны час мы падзяляем з вамі смутак і боль незаменнай страты.

Патрабуюцца аналітыкі

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Паколькі БДУ — універсітэт класічнага тыпу, мы робім стаўку не толькі на прыкладныя веды, але і на фундаментальнасць адукацыі. Падрыхтоўка кадраў па IT-спецыяльнасцях і сумежных спецыяльнасцях вядзецца ў БДУ на трох факультэтах — ФПМІ, механіка-матэматычным і факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій. На першай ступені ў нас налічваецца адзінаццаць такіх спецыяльнасцяў: «Актуарная матэматыка», «Прыкладная матэматыка», «Інфарматыка», «Камп'ютарная бяспека», «Эканамічная кібернетыка» і іншыя. На другой ступені — дзевяць: магістранты вывучаюць алгарытмы і сістэмы распрацоўкі вялікіх аб'ёмаў даных, прыкладны камп'ютарны аналіз даных, матэматычнае і праграмнае забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі... На першай ступені навучаюцца 2160 чалавек, на другой — 310.

Выпускнікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — самыя запатрабаваныя ў кампаніях ПВТ. Менавіта яго студэнты займаюць прызавыя месцы на розных мерапрыемствах рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўняў па праграмаванні. А на сусветным чэмпіянаце свету па праграмаванні (ІМС) каманды БДУ заўсёды прабіваюцца ў фінал, дзе аказваюцца сярод наймацнейшых.

— Мы лічым, што гэта вынік непарыўнага ланцужка ў падрыхтоўцы кадраў: ад прафарыентацыі, нашых школ юных і збораў, якія арганізоўваюцца для таленавітых школьнікаў на базе «Брыганціны», да іх выхаду з універсітэта. Галоўнае, што абітурыенты паступаюць да нас «відушчымі» і добра разумеюць, якія спецыяльнасці яны выбіраюць, — кажа Андрэй Кароль. — Вельмі многія знакамітыя IT-прадукты, у тым ліку і праграмы Яндэкса, былі створаны выпускнікамі БДУ.

На думку рэктара, інфарматызацыя адукацыі часта памылкова трактуецца вельмі вузка, як нейкі тэхнічны кампанент, які асноўны ў арганізацыі вучэбнага працэсу, а змест адыходзіць на другі план.

— Мы не разумеем, што першаснае, а што другаснае, а першасным з'яўляецца асоба студэнта, — разважае ён. — Якія мэты ў адукацыі мы ставім? Навучыць студэнта крэатыўнасці, што сёння запатрабавана ў IT, ці проста даць патрэбную інфармацыю, экіпіраваць яго ведамі? Ад гэтага і будзе залежыць удзельная вага тэхнічнага кампанента. Падрыхтоўка IT-спецыялістаў патрабуе змяненняў у змесце і форме. Традыцыйная перадача ведаў не падыходзіць. Сёння не праблема знайсці патрэбную інфармацыю, а праблема навучыцца глядзець на рэчы сваімі вачыма, ставіць свае мэты, задаваць пытанні, бачыць сітуацыю з розных бакоў, умець ствараць свой прадукт. Адукацыя — не проста працэс засваення ведаў, а выяўленне і развіццё патэнцыялу, які закладзены ў кожным студэнце.

Сёння сярэдні ўзрост выкладчыкаў, якія працуюць на трох IT-факультэтах у БДУ, складае 49 гадоў (40 % з іх з'яўляюцца кандыдатамі і дактарамі навук). Для прыцягнення да выкладання спецыялістаў-практыкаў факультэты запрашаюць знешніх сумяшчальнікаў. Найбольшая колькасць знешніх сумяшчальнікаў — на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі — 23 %: гэта супрацоўнікі такіх кампаній, як «ЭПАМ Сістэмз», «Эксадэл», «Яндэкс Бел», «Інтразішэн».

Каб веды не састарэлі

А ў БДУІР традыцыйна робяць стаўку на практыка-арыентаванасць падрыхтоўкі спецыялістаў.

— IT-тэхналогіі змяняюцца настолькі хутка, што тое, што студэнт вывучаў на другім курсе, на чацвёртым можа аказацца ўвогуле незапатрабаваным, — канстатуе **прарэктар БДУІР па вучэбнай рабоце Валерый ПРЫТКОЎ.** — Таму наша задача — навучыць студэнта так, каб атрыманыя навыкі ён далей сам трансфармаваў і развіваў, і яны на момант яго выпуску не страцілі актуальнасць. Вырашэнню гэтай праблемы часткова дапамагае ўзаемадзеянне з кампаніямі ПВТ і іншымі арганізацыямі рэальнага сектара эканомікі. Спецыялісты-практыкі адчуваюць, якія тэхналогіі будуць развівацца ў найбліжэйшай перспектыве, на якія з іх ёсць попыт у заказчыкаў. Сумесна з рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій і іншымі IT-арганізацыямі ва ўніверсітэце створана 45 сумесных лабараторый. Кампаніі-партнёры аказваюць садзейнічанне ў навучанні выкладчыкаў БДУІРа, праводзяць для іх майстар-класы, дапамагаюць падтрымліваць вучэбныя праграмы ў актуальным стане. Мы можам выкарыстоўваць методыкі, распрацаваныя IT-кампаніямі для навучання свайго персаналу.

Таксама прарэктар ВНУ лічыць, што эфектыўнасць навучання можа павысіцца за кошт стварэння звыклага для студэнтаў, якія з дзяцінства з інфармацыйнымі тэхналогіямі на «ты», адукацыйнага асяроддзя.

— Ім не спатрэбіцца сябе ламаць і перабудоўвацца. Гэта паскорыць працэс камунікацыі, сэканоміць час. Не трэба чакаць выкладчыка па раскладзе. Можна задаць яму пытанне, атрымаць аператыўны адказ дыстанцыйна і далей асвойваць адукацыйную праграму, — кажа ён. — З 2002 года ў БДУІР развіваецца дыстанцыйнае навучанне. Зараз на дыстанцыйнай форме навучаецца каля 600 студэнтаў. Найбольш прывабная гэтая форма навучання для тых, хто атрымлівае другую вышэйшую адукацыю, а таксама для людзей з абмежаванымі магчымасцямі. На жаль, не ўсе пытанні пакуль можна вырашыць у рамках дзеючай нарматыўнай базы: яна не заўсёды адпавядае сучасным патрабаванням у сферы падрыхтоўкі IT-кадраў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3

Предмет аукциона (одним лотом)
Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53

Здание механизированной мойки, инв. номер 350/С-163612, общ. пл. 127,3 кв. м. Составные части: кирпичная пристройка, смотровая яма, очистные сооружения.
КПП стоянки автотранспорта, инв. номер 350/С-163639, общ. пл. 53,2 кв. м.
Навес со смотровой ямой (мехмойка), инв. номер 350/С-163641, 76 кв. м. смот. яма.
Очистные замазученных и ливневых вод, инв. номер 350/С-170152. Составные части: закрытый горизонтальный отстойник.
Дорожное покрытие, инв. номер 350/С-170155.
Забор, инв. номер 350/С-170153, об.пл. 386 м. Составные части: 4 ограждения, ворота.
Тепловая сеть, инв. номер 350/С-163618, протяж. 148,9 м. Составные части: каналы, 2 опоры, камера, колодец (1 шт.).
Производственный водопровод, инв. номер 350/С-163611, 213,3 м. Составные части: 2 трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.).
Дождевая канализация, инв. номер 350/С-163609, протяж. 234,3 м. Составные части: 4 трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприемник

Сведения о земельном участке: предоставлен Продавцу общ. пл. **0,8989** га на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения. Ограничения – водоохранная зона водных объектов

Начальная цена с НДС 20 % - 324 390,00 бел. руб. (снижена на 20 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **60 (шестидесяти)** рабочих дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано **газете «Звязда» от 24.11.2018**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Аукцион состоится 05.02.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 04.02.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17 280-36-37; 8 029 317-95-42. www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	Мядельское райпо, Минская область, г. Мядель, ул. 1 Мая, д. 2

Предмет аукциона

Здание магазина «Хозтовары» (633/С-13214, 165,7 кв. м). Адрес: **Минская обл., Мядельский р-н, Княгининский с/с, аг. Княгинин, ул. Полевая, 10А.** Сведения о зем. участке: пл. **0,0545** га предоставлен на праве аренды (срок действия по 08.01.2113) для обслуживания зданий и сооружений магазина «Хозтовары». **Начальная цена лота с НДС 20 % – 2 500,00 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 07.12.2018

Дата и время проведения аукциона: 11.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 08.02.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона	
Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Плещеницлес», Минская обл., Логойский р-н, г. п. Плещеницы, ул. Октябрьская, 47

Предмет аукциона

Столярный цех (общ. пл. 143,7 кв. м, инв. № 611/С-31561). Месторасположение**:** Минская обл., Березинский р-н, **г. Березино**, ул. Соколовского, д. 1, корп. 5

Сведения о земельном участке: пл. **0,1741 га**, предоставлен Продавцу для обслуживания здания столяр. цеха. Ограничения прав: водоохранные зоны рек и водоемов (р. Березина) и охранные зоны электрич. сетей

Начальная цена с НДС 20 % – 5 379,74 бел. руб. (снижена 65 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» от 16.11.2018**

Аукцион состоится 08.02.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 06.02.2019 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42**. www.cpo.b**y. E-mail: auction@cpo.by

---

Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в д. Сосновая, д. Лужки (по генплану № 6), д. Малое Залужье, д. Задомля, ул. Центральная, д. Прилепы (участок № 3) Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	21февраля 2019 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний
3	Продавец и его адрес	Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	Лот № 1 – площадь 0,1434 га, № 624883010101000609, д. Сосновая; Лот № 2 – площадь 0,1460 га, № 624883005601000162, д. Лужки (уч. № 6); Лот № 3 – площадь 0,1493 га, № 624883006601000138, д. Малое Залужье; Лот № 4 – площадь 0,0811 га, № 624883004601000334, д. Задомля, ул. Центральная; Лот № 5 – площадь 0,150 га, № 624883008301000543, д. Прилепы (уч. № 3)
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (10904 земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)
7	Начальная (стартовая) цена продажи	Лот № 1 – 30000 руб. Лот № 4 – 20000 руб. Лот № 2 – 20000 руб. Лот № 5 – 30000 руб. Лот № 3 – 10000 руб.
8	Условия аукциона	А) продажа по цене, не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории республики; В) без права предоставления рассрочки; Г) Возместить затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры» в размерах определенных решением Смолевичского райисполкома
9	Наличие инженерной инфраструктуры	д. Сосновая – подъездные пути, электроснабжение, газоснабжение; д. Лужки (по генплану № 6) – подъездные пути; д. Малое Залужье – подъездные пути; д. Задомля, ул. Центральная – отсутствуют; д. Прилепы – отсутствуют
10	Ограничения в использовании	Лот 2 – водоохранная зона канала (площадь 0,1460 га); Лот 3 – водоохранная зона реки Бараневка (площадь 0,1493 га); Лот 4 – водоохранная зона реки Домелька (площадь 0,0727 га)
10	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 10 рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
3. К участию допускаются граждане РБ, подавшие заявление установленной формы, внесшие задаток в размере 10 % от начальной цены объекта аукциона в кассу Стайского сельисполкома или на расчетный счет BY83AKBB36413191010342100000 в филиале № 216 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Полоцк, БИК AKBBBY21216, УНП 300039704. **Получатель – Стайский сельский исполнительный комитет.**

Для участия в аукционе необходимо представить копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также предъявляется паспорт или иной документ, удостоверяющий личность и копии платежных документов, подтверждающих уплату задатка.

5. Не допускается начало торгов по начальной цене.

6. Оплата стоимости предмета аукциона, расходов по организации и проведению аукциона, расходов по подготовке и изготовлению документации, расходов на публикацию в средствах массовой информации, подлежащих возмещению победителем, осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении (передаче в частную собственность) победителю аукциона земельного участка.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельным участком в натуре.

Контактные телефоны: 8 (02132) – 3-25-42; 3-25-60; 8(029) – 309-33-58 (велком); 8(029)- 890-07-98 (МТС)

ЗАО «Белреализация» объявляет аукцион

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4 этаж паркинга, каб. 27., тел. (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **WWW.BELTORGI.BY.**

Продавец: ООО «ПрофСтройГрупп» (УНП 191121291) в лице управляющего по делу о банкротстве ООО «АСЕССОР», тел. 8029 569 19 72.

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены: **18 февраля 2019 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **WWW.BELTORGI.BY.**

Предмет торгов	Начальная цена, бел. руб. без НДС	Шаг торгов, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Крана ZIL-133-GYA KS 3575A, г/н АК3559-7	2 900,00	145,00	290,00
Местонахождение – г. Барановичи, ул. Фроленкова, 49А, тел. для осмотра +375 29 652-19-75			

Для участия в торгах необходимо в срок **по 15 февраля 2019 г. 17.00:** 1) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY06SOMA30120013860101000933 в ЗАО «Идея Банк», код SOMABY22, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация», 2) далее подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELTORGI.BY**, 3) направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: marketing@zalog.by (подробнее – в информации лота на сайте **WWW.BELTORGI.BY**).

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Оформление результатов в день торгов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов в течение 5 рабочих дней со дня их проведения, а также аукционный сбор. После этого, между продавцом и победителем торгов в течение 10 дней заключается договор купли-продажи

PARITETBANK

Открытое акционерное общество «Паритетбанк» (Республика Беларусь, 220002, г. Минск, ул. Киселева, 61а) сообщает, что 8 февраля 2019 года в 10.00 в соответствии с решением Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк» состоится внеочередное общее собрание акционеров в очной форме по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, зал заседаний, 3-й этаж.

Повестка дня:

1. О досрочном прекращении полномочий Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк».

2. О выборах нового состава Наблюдательного Совета ОАО «Паритетбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, составляется на основании реестра акционеров, сформированного по состоянию на 1 февраля 2019 года.

Лица, имеющие право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, могут ознакомиться с информацией (документами) по вопросам повестки дня 7 февраля 2019 года с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Киселева, 61а, каб. 306 либо 8 февраля 2019 года по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров при прохождении регистрации.

Регистрация лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, будет проводиться 8 февраля 2019 года по месту проведения внеочередного общего собрания акционеров с 9.20 до 9.50 при предъявлении документов, удостоверяющих личность (подтверждающих их полномочия).

Телефон для справок 237 76 79.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5.
УНП 100233809.

Объявление о реализации недвижимого имущества ООО «Карпович» (вторые повторные торги)

Организатор торгов	ЧУП «ОтельИнвест». Почтовый адрес: 220032 г. Минск, а/я 10. Юридический адрес: 220004 г. Минск, пр-т Победителей, 141/10, факс 266-39-60, e-mail: Hotel_inv@mail.ru
Продавец	ООО «Карпович» г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1, комн. 101, УНП 100146753
Форма время дата и место проведения торгов	Вторые повторные торги в форме открытого аукциона состоятся 31 января 2018 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1, комн. 540
Сведения о предмете торгов и порядок ознакомления с ними	Объекты недвижимости, незавершенные строительством в количестве 4 лотов (штуки). Полный перечень имущества размещен на сайте http://bankrot.gov.by. Ознакомиться с предметами лота можно с 11.15 в рабочее время, предварительно позвонив по тел. +375 44 734-16-96 (Григорий Николаевич), гор. тел.: 8 (017) 237-27-32; 8 (017) 237-26-61
Порядок проведения торгов	Торги состоятся 31 января 2018 года в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа 5 корп. 1 комн. 540. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 (пяти) банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов и наличия платежных реквизитов для возврата денежных средств. Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов. В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время но не позднее чем за 5 дней до даты их проведения
Размер задатка для участия	Задаток – 9 % от начальной цены лота в белорусских рублях перечисляется на р/с BY34BPSB30121045540169330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC-BPSBBY2X, УНП 100146753 Получатель – ООО «Карпович»
Сроки и место приема заявок на участие в торгах	Прием заявлений на участие в торгах осуществляется с момента опубликования настоящего объявления и по 29 января 2018 года, в рабочие дни, с 10.00 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 1, ком. 540. E-mail: Hotel_inv@mail.ru, факс 266-39-60
Документы необходимые для участия	Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в объявлении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в объявлении о проведении торгов; для индивид. предпринимателя, копии свидет-ва о гос. регистрации ИП (без нотариального засвидетельствования); для юрид. лица, доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования); для иностр. юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в пределах полномочных органов, международной организации, легализованных в установленном порядке копий учред. документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах), либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финан. состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования); для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, доверенности, оформленной в соответствии с законодательством РБ. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, в том числе представители юридических лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность
Порядок заключения договора	Все расходы по переоформлению имущества возлагается на покупателя. Победитель торгов оплачивает расходы по организации торгов, которые понесло ЧУП «ОтельИнвест» в размере 80 рублей за организацию каждого лота на следующие реквизиты: р/с BY47BLNB30120000074501000933 код банка BLNBBY2X в ОАО «БНБ-Банк», УНП 192185481. Заключение договора купли-продажи осуществляется по согласованию с регистратором РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов

Общество с ограниченной ответственностью **«Фреш Бейкери» уведомляет об утрате свидетельства** о государственной регистрации (УНП 691076883)

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 2 (444)

Праект

Тэатр пачынаецца з... лічбаў

Незвычайную статыстыку сабралі ў Гродзенскім абласным драматычным тэатры, каб даць сваім гледачам больш уяўлення пра закуліснае жыццё, умоўна кажучы, ад гардэроба да крэсла ў глядзельнай зале.

Напрыклад, тут падлічылі і прадэманстравалі ў карцінках не толькі колькасць месцаў у вялікай і малой зале (665 і 216 адпаведна), але таксама 776 кручкоў у гардэробе вялікай залы, 3976 лямпачак на ўвесь пяціпавярховы будынак тэатра і 5387 разнастайных сцэнічных убораў, якія захоўваюцца ў касцюмернай.

На сёння ў трупе Гродзенскага драмтэатра занятыя 42 акцёры, у тым ліку 10 сямейных пар, прычым цёплую кампанію беларусам складаюць выхадцы з Расіі, Украіны, Польшчы, Германіі і нават... Мадагаскара.

Квіткі на прадстаўленні тут каштуюць ад пяці рублёў на дзіцячы спектакль да 58 рублёў, калі гаворка ідзе пра самых-самых «зорных» гастралёраў. Дарэчы, на працягу мінулага года, 2018, у тэатры пабывала звыш 105 тысяч гледачоў — лічы, амаль трэцяя частка жыхароў абласнога цэнтра, і гэта на тысячу чалавек больш, чым пазалетась.

Самы стары спектакль у рэпертуары тэатра — «Камедыя пра нешчаслівага селяніна, яго жонку Маланку, жыда Давіда і чорта, які страціў сэнс існавання» па п'есе Уладзіміра Рудава, — галоўны рэжысёр Генадзь Мушперт паставіў яшчэ ў 1995 годзе, і з таго часу яго сыгралі ўжо 350 разоў на родных падмостках, а з улікам гастроляў у іншых гарадах — дык больш за 400 разоў. А самай дарагой з усіх, расказалі ў тэатры, стала пастаноўка 2016 года — перакладзеная на беларускую мову трагікамедыя «Клеменс» паводле літоўскага драматурга Казіса Саі, на падрыхтоўку якой спатрэбілася выдаткаваць суму, эквівалентную 5800 доларам ЗША.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Бенефіс

ЯК ДУША, ЯК ПЕСНЯ...

Сёння адзначае 80-годдзе народная артыстка Беларусі Таццяна Мархель. На сцэне Тэатра беларускай драматургіі, дзе актрыса служыць больш як 25 гадоў, з гэтай нагоды адбудзецца бенефіс, пра які сама Таццяна Рыгораўна сказала сцісла: «Няхай гэта будзе весела!»

Акцёры з роднай трупы, якія падрыхтавалі ў якасці падарунка адмысловы «капуснік», сябры і калегі з іншых тэатраў, афіцыйныя асобы і вядомыя дзеячы культуры, а таксама аддаваныя гледачы — усе яны стануць гасцямі і ўдзельнікамі юбілейнай імпрэзы «Таццянін дзень».

У творчай біяграфіі Таццяны Мархель работа ў тэатрах некалькіх краін — Гродзенскім і Магілёўскім абласных, Беларускім тэатры імя Якуба Коласа, Дзяржаўным тэатры для дзяцей і юнацтва Казахстана (Алматы), Тэатры-студыі кінаакцёра і Тэатры беларускай драматургіі ў Мінску, а таксама здымкі ў кіно — «Трэцяга не дадзена», «Кантрольная па спецыяльнасці», «Подых навальніцы», «Мяне завуць Арлекіна», «Плач перапёлкі», «Рыфмуецца з любоўю», «Сляды апосталаў»... У 1984 годзе атрымала званне заслужанай артысткі БССР, у 2004-м была адзначана медалём Францыска Скарыны, у 2011-м — стала народнай артысткай Беларусі.

Далучаючыся да шматлікіх віншаванняў, «Звязда» прапануе прыгадаць разам некалькі яркіх і запамінальных роляў выдатнай актрысы.

«Сымон-музыка». У гэтай пастаноўцы на сцэне Коласаўскага тэатра ў Віцебску Таццяна Мархель упершыню раскрылася перад гледачамі не толькі як драматычная актрыса, але і як спявачка, збіральніца і захавальніца аўтэнтычных народных песень, мноства якіх яна чула ад сваёй маці ў роднай вёсцы Шпакоўшчына, што ў Смалявіцкім раёне Мінскай вобласці. Таксама народныя песні ў выкананні актрысы гучаць у спектаклі «Чарнобыльская малітва», — а часам Таццяна Рыгораўна выконвала іх у асобных музычных праграмах і шмат разоў прадстаўляла Беларусь на міжнародных фальклорных фестывалях у Вільнюсе, Маскве, Таліне, Адэсе, у гарадах Польшчы, ЗША і іншых краін.

«Трэцяга не дадзена». 1980 год, адна з першых роляў актрысы ў кіно. У двухсерыйнай драме рэжысёра Ігара Дабралюбава, заснаванай на рэальных фактах з біяграфіі героя Грамадзянскай і Другой сусветнай войнаў Васіля Каржа, Таццяна Мархель сыграла Алімпу — а народныя песні ў яе выкананні, якія выпадкова пачуў рэжысёр Віктар Тураў, увайшлі таксама ў фільм «Людзі на балоце».

«Жанчыны Бергмана». Іграючы сваю Інгрыд у пастаноўцы Валерыя Анісенкі, актрыса на працягу ўсяго спектакля... маўчала на сцэне. Але рабіла гэта так пераканаўча і таленавіта, што атрымала прыз за найлепшую жаночую ролю адразу на некалькіх тэатральных фестывалях запар — у Бабруйску, Бранску, Маскве і Ялце.

«Тры Жызэлі». У драматычным спектаклі паводле п'есы Андрэя Курэйчыка ў актрысы — роля Восеньскай Жызэлі, ураджэнкі Францыі Жызэль Купэс, якая пражыла ўжо досыць доўгі век далёка ад радзімы, у беларускай вёсачцы, перажыла здрадніцтва тырана-мужа і пры тым захавала веру ў лепшае, здольнасць радавацца таму, што адбываецца тут і цяпер.

«Беларусь. Дыдактыка». Спектакль, які з'явіўся ў рэпертуары РТБД у канцы 2017-га, — па сутнасці, гэта маналог пад музыку, у якім развагі пра жаночы лёс пераплеценыя з урыўкамі з класічнай беларускай літаратуры, фальклорнымі матывамі, пошукам свайго месца ў свеце. Што цікава, спачатку п'еса была напісаная паводле інтэрв'ю з самой Таццянай Мархель і ўтрымлівала многа біяграфічных момантаў, але актрыса так і не рашылася вынесці іх на публіку.

На сёння Таццяна Мархель занятая ў пяці пастаноўках Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, таксама працягвае здымацца ў кіно — напрыклад, кароткаметражная стужка «Возера радасці» (паводле рамана Віктара Марціновіча) з яе ўдзелам нядаўна трапіла ў праграму міжнароднага кінафестывалю ў Клермон-Феране, што пройдзе ў пачатку лютага.

Вікторыя ЗАХАРАВА.
Фота з архіва тэатра.

Прэм'ера

ПА КІМ ГУЧЫЦЬ ПАЛАНЭЗ

Тэатр беларускай драматургіі прадставіў новую версію «Мудрамера»

Знакамітую сатырычную камедыю Мікалая Матукоўскага неаднаразова ставілі ў тэатрах, рабілі пастаноўкі на радыё і нават знялі ў 1988 годзе, у часы татальнай галоснасці, на «Беларусьфільме» двухсерыйны фільм. Але, відаць, маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што аб'ём розуму на планеце — велічыня пастаянная, а насельніцтва імкліва расце... Словам, актуальнасці п'еса не згубіла і сёння, што і пацвердзіў рэжысёр Аляксандр Гарцуеў, які прадставіў у РТБД на суд гледачоў яе сучаснае прачытанне.

Фабула засталася нязменная: вынаходнік-самавучка Мурашка прапануе запусціць у масавую вытворчасць апарат пад назвай «дурамер», які вымярае ўзровень чалавечага інтэлекту па шкале ад «ПД» (поўны дурань) да «Г» (геній), прычым кожны паказчык суправаджаецца адпаведнай класічнай мелодыяй: «Танец маленькіх лебедзяў» для звычайнага чалавека, паланэз «Развітанне з радзімай» Агінскага для дурня, «Ода «Да радасці» Бетховена — для генія. У Міністэрстве ўзгадненняў, куды звярнуўся вынаходнік, яму перадусім раяць змяніць назву прылады на «мудрамер» і вымяраць не дурасць, а мудрасць — ці яе адсутнасць. У працэсе выпрабавання прыбора пералічваюцца самыя неверагодныя аргументы «за» і «супраць», адбываецца мноства размоў і падзей, сумных і смешных, але завяршаецца справа цалкам лагічна: бяздушная бюракратычная машына праглынае Мурашку і пераможвае разам з косткамі.

Зала Тэатра беларускай драматургіі досыць камерная, таму спачатку адчуваеш сябе няўпэўнена побач з празмерна вялікім настольным календаром, асадкай і селектарам. Зрэшты, паступова ўсё становіцца на свае месцы — гэтыя рэчы больш чым дэкарацыі: яны паўнапраўныя (а часам нават галоўныя) дзеючыя асобы спектакля. Што, праўда, нікольні не перашкаджае праявіць сябе ўсім астатнім героям — а ў пастаноўцы занята цэлае сузор'е вядомых акцёраў: Андрэй Дабравольскі, Ілья Ясінскі, Людміла Сідаркевіч, Валянцін Салаўёў, Таццяна Мархель ды іншыя. Максім Паніматчанка проста бліскуча спраўляецца з роляй вынаходніка-прайдзісвета Залівакі — здаецца, яшчэ крыху, і ўся зала ў адзіным парыве следам за ім раскіне рукі і будзе паўтараць «Куд-куд-куды... Куд-куд-куды...», як няшчасныя нясушкі, з дапамогай якіх Залівака плануе заваліць усю краіну, увесь свет курынымі яйкамі. На кантрасце ўраўнаважвае гэту эксцэнтрыку бабуля ў выкананні Таццяны Мархель: народная артыстка дае той глыток свежага паветра, без якога ў гіпербалізаваных вобразах персанажаў задыхаюцца не толькі гледачы, але, здаецца, і самі акцёры. Цікава, колькі людзей у зале пасля ціхага маналогу бабулі Загуменнай «У мяне дзеці вельмі харошыя! Толькі вельмі занятыя...» адкладзе свае важныя справы, каб зрабіць паўзу і патэлефанаваць бацькам? Мабыць, сакрэт у тым, што юбілярка — якраз сёння Таццяна Рыгораўна адзначае 80-годдзе — ніколі не пераігрывае, незалежна ад памеру ролі і колькасці рэплік, увасабляе штосьці сапраўднае і глыбокае, — нездарма ж многія рэжысёры бачылі і падкрэслівалі яе «сапраўдную беларускасць».

...Можна спрачацца, ці не варта было зрабіць пастаноўку больш дынамічнай, з улікам таго, што частка персанажаў п'есы, накшталт мадэляў фабрыкі адзення і тэлефаністак, выведзеная па-за рамкі падзей наогул. Прынамсі на перадпаказе гледачы абмяркоўвалі, што гадзіна танцаў з бубнамі вакол магчымай карысці ці шкоды апарата — гэта зашмат, так і на іспыты часу не застанецца. Але рэжысёр, доўга заціскаючы спружыну глядацкага чакання, зрабіў так, што «Мудрамер» глядзіцца на адным дыханні: тут і экшн, і эмацыянальна выразныя

акцёрскія эпізоды, і кранальныя моманты, і ўмела расстаўленыя акцэнты, на якіх публіка мусіць смяяцца (і яна такі сапраўды шмат смяецца). Але галоўнае — камедыя пры амаль даслоўным пераказе не пахне нафталінам і не ператвараецца ў фарс, бо ўтрымлівае не толькі мноства зразумелых сучаснікам намёкаў, але і падтэкст. І ён значна глыбейшы, чым супрацьстаянне асобнага генія і бюракратычнай сістэмы, чым прабіўное спалучэнне дурасці і нахабства, што дазваляе адваяваць вельмі прыстойнае месца пад сонцам, чым ідэйная бездапаможнасць офісна-планктоннага «нармальнага чалавека». Бо мала ведаць межы нормы — трэба яшчэ задумацца, як быць з тымі людзьмі, хто ў гэтыя межы не ўпісваецца, і што рабіць, калі гэты чалавек — ты сам?... «Мудрамер» такую прастору для роздуму дае.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота аўтара.

Традыцыі народаў Беларусі

СТАРАДАЎНІ І СУЧАСНЫ

У гэту нядзелю святкуюць Новы год дрэў

Свят шмат не бывае. І калі многія ўжо спакавалі свае ялінкі, даелі апошнія мандарыны і пачалі выконваць загаданыя жаданні, дык у некаторых урачыстасць яшчэ толькі набліжаецца. Новы год дрэў — свята яўрэйскага календара. Гэта напамін і пра тое, як калісьці народ быў у бядзе, як, знаходзячыся за крок ад смерці, атрымаў жыццё і перамогу. Такі Новы год, натуральна ж, прысвечаны і дрэвам. Існуе традыцыя не толькі іх пасадкі (у спрыяльны час і пры адпаведных умовах). На гэта свята асаблівым чынам спажываюць розную садавіну, запіваючы келіхамі добра разбаўленага віна. Пра гэты і іншыя звычаі ў нашым інтэрв'ю з равінам Рыгорам АБРАМОВІЧАМ.

— Раскажыце, як з'явіўся Новы год дрэў?

— Першапачаткова ён служыў для таго, каб вызначыць узрост дрэў, аднак з часам традыцыя сышла, бо большасць яўрэяў не жыла ў Ізраілі. Аднак прыблізна да XVI стагоддзя на гістарычную радзіму вярнуліся містыкі, якія вырашылі, што было б добра гэта свята адрадзіць. Вырашылі, што варта з'ядаць садавіну ад дрэў і думаць пра іх карыснасць для нас.

За кароткі час стала папулярным есці некаторую садавіну, і не проста так, а ў пэўнай паслядоўнасці. Бо ўсе ўжыванні ежы ў рэлігійным уяўленні павінны мець абгрунтаванне, і яны павінны быць зразумелыя наступнаму пакаленню.

Садавіну падзялілі па пэўнай сістэме, атрымалі чатыры светы. Садавіна ў скурцы і з костачкай унутры (гранат) — гэта першы свет, дзеяння. Кожны з нас штосекунду прысутнічае ў свеце дзеяння: складае рукі, глядзіць у акно, ідзе. Садавіна без скуркі або з ядомай тонкай скуркай, але з костачкай (аліва, вінаград, фінік) сімвалізуе свет творчасці. У свеце творчасці мы час ад часу знаходзімся, прыдумваючы, ствараючы. Праўда з адной умовай: мы можам ствараць, толькі маючы зыходны матэрыял — веды або матэрыял для будаўніцтва чагосьці. Тая садавіна, у якой няма ні скуркі, ні костачкі (інжыр, курага), прадстаўляе свет стварэння з нічога. Так стварае толькі Усявышні. Згадваючы пра чацвёрты свет, мы нічога не ядзім, гэта «свет гармоніі». Мы не ўяўляем, як ён выглядае, толькі здагадваемся, што ў ім пануюць душы і анёлы.

Гэтыя чатыры светы сімвалізуюць чатыры этапы прымання ежы на Новы год дрэў, якія мы называем «сэдар», або «парадак». Бярэцца пэўная садавіна, гаворыцца дабраславенне на яе, згадваецца пэўны свет і гэтак далей. Аднак ёсць яшчэ тое, што мы п'ём — чатыры келіхі віна. Часам мяне пытаюцца: яўрэі ж непітушчыя, чаму вы ўжываеце віно? Насамрэч адказ вельмі просты. Справа ў тым, што ніколі не рабіўся акцэнт на алкагольны складнік. Калі мы чытаем старадаўнюю крыніцу, мы бачым, што віно разбаўлялі. Ёсць дзве версіі, як гэта рабілася: адна чвэрць віна і тры чвэрці вады або адна пятая віна і тры чвэрці вады. Мы ўвогуле не кажам пра градус як такі. Таму калі ты ўжываеш такое разбаўленае віно, яно ніяк не ўплывае на твой стан, не надта ахмеліць цябе. Калі чалавек не ўжывае ніякага алкаголю, прадугледжаны вінаградны сок.

Мы ведаем, што дрэвы кладуцца спаць на зіму і вясной прачынаюцца. Такім чынам мы пераходзім ад белага віна або вінаграднага соку да чырвонага. Першы келіх сімвалізуе зіму і сон. У другі дадаём крыху чырвонага віна, яно атрымліваецца ружовым і сімвалізуе абуджэнне, але яшчэ на пачатковым узроўні. У трэці келіх мы дадаём яшчэ віна — і ўжо цёмна-ружовы, амаль вясна. Чацвёрты, чырвоны, — гэта вясна. Такі пераход ад зімы да вясны.

— На звычайны Новы год прынята падводзіць вынікі або пісаць планы на будучы год. Вы ж ужываеце садавіну, згадваеце пра сакральны сэнс. Аднак ці кажаце нешта пра сваё ўласнае жыццё, напрыклад: у гэтым годзе я добра тварыў, напісаў шмат вершаў або ў наступным планую пісаць карціны?..

— Так, мы безумоўна абдумваем планы. Аднак у нас ёсць яшчэ адзін Новы год, які адзначаюць у верасні. Ёсць дзве задачы — будаваць планы на будучы год і падумаць, які быў мінулы год. Мы павінны яшчэ на працягу 10 дзён — ад часу Выкуплення да Новага года — папрасіць прабачэння ва ўсіх, каго пакрыўдзілі. Гэта вельмі важны звычай. Тут мы кажам «прабач» усім, каго маглі пакрыўдзіць, нават выпадкова ці патэнцыяльна. А заканчваецца ўсё тым, што мы просім прабачэння ў Бога, якога мы таксама пакрыўдзілі. Гэта пра разуменне, што ты штосьці зрабіў не так, але можаш выправіць і ўпісаць у далейшыя планы.

— Што яшчэ прынята рабіць на Новы год дрэў?

— Ёсць цікавы звычай, які з'явіўся ў 1909 годзе ў Ізраілі, калі не было самой дзяржавы, але людзі ўжо прыязджалі. Вырашылі не толькі есці плады, але і саджаць дрэвы. Такая традыцыя існавала і раней, увёў яе равін у горадзе Зіхрон Якаў. Вельмі цікава, што дагэтуль равін вучыўся ў некалькіх равінаў з Брэсцкай вобласці. Можа быць, гэта ідэя нарадзілася і дзесьці ў Беларусі. Але я ўвесь час думаў, як ідэя магла нарадзіцца тут, дзе ў гэты час мерзлая зямля? Аднак у Беларусі акурат садзяць елкі і сосны — тыя дрэвы, якія высякаюцца. Гэта вельмі важная традыцыя, яна сведчыць: тое, што мы бяром у прыроды, мы можам ёй вярнуць пасадкай новых дрэў. Цікава, што ў Мінску да 20-х гадоў XX стагоддзя існаваў звычай у скрынку для дабрачыннасці складваць манеткі, каб на іх хтосьці пасадзіў дрэва ў Ізраілі. Такім чынам ты далучаеш да добрай справы яшчэ больш людзей.

Кажуць, што кожны чалавек павінен пражыць жыццё так, каб выгадаваць сына, пабудаваць дом, пасадзіць дрэва. Асабіста я ўжо ўсё гэта зрабіў — раю запланаваць і іншым. Такім чынам, на розныя свае святы мы садзім дрэва, будуем часовы шалаш, вучым дзяцей не забываць справы продкаў. І так кожны год. Я лічу, не трэба думаць пра ўсё жыццё. Калі ты годна пражывеш адзін год, годна пражывеш і ўсё жыццё.

— Скажыце, чаму менавіта дрэва, а не іншая расліна?

— Бо першапачаткова размова ішла менавіта пра дрэвы, якія прыносяць плады. Частку садавіны ты аддаваў на дабрачыннасць, на храм або прадаваў і ўносіў сродкі. Але гэта могуць быць і кветкі. Мы неяк на вуліцы Шорнай каля сінагогі звярнулі ўвагу, што раней тут уся вуліца была ў дрэвах, а цяпер няма ніводнага. Мы папрасілі членаў нашай абшчыны, якія дрэнна чуюць, выразаць выцінанку з дрэвамі і павесіць на вокны. Быццам бы яны хоць бы ў гэта свята ўпрыгожваюць вуліцу. Справа настолькі спадабалася, што мы паўтаралі яе некалькі гадоў. Моладзь з другаснай сыравіны рабіла дрэвы. А малым дзецям, якія пакуль не могуць садзіць дрэвы, мы прапаноўваем садзіць цыбулю — гэта таксама сімвал.

— Тое, што вы расказалі, — проста прыгожая традыцыя, або вы сапраўды святкуеце Новы год дрэў у гэту нядзелю?

— Безумоўна, святкуем. Наш каляндар і нацыянальны, і рэлігійны адначасова. «Сэдар» ладзім у нядзелю ўвечары. Дарэчы, наш плод са скуркай і костачкай — гэта мандарын. Аднойчы замест белага віна мы выкарыстоўвалі бярозавік. Гэты час адкрыты для пэўнай паэзіі, рознай творчасці. Менавіта на гэты Новы год мы вырашылі звярнуць сваю ўвагу на птушак, якія жывуць на дрэвах, — для чаго патрэбны шпакоўні, што мы можам зрабіць як гарадскія жыхары?

— Ці святкуеце вы традыцыйны Новы год?

— Усе па-рознаму. Хтосьці не святкуе, бо ёсць іншыя такія святы ўласнай традыцыі. Адны ставяць ялінку, іншыя не. Ёсць яўрэі, якія нават жывучы ў Ізраілі святкуюць гэты традыцыйны Новы год. Адбываецца тое ж самае сямейнае застолле, з салатамі і шампанскім. Хтосьці спрабаваў дадаць сюды пэўны яўрэйскі элемент, аднак гэта не мела вялікага поспеху. Для мяне Новы год — час з сям'ёй, амаль кожны год да нас прыязджаюць бацькі жонкі з Бірабіджана (Далёкі Усход, каля Хабараўска), дзе ідыш — адна з асноўных моў. Для іх вельмі важна, каб была ёлка. Таму мы прынялі саламонава рашэнне — знайшлі гірлянду ў форме ёлкі, упрыгожылі цацкамі: мы разумеем, што гэта не ёлка, яны разумеюць, што гэта ёлка. Мой бацька, які жыве ў Ізраілі і ходзіць у сінагогу, таксама ставіць ёлку, бо кажа, што ў яго настальгія па дзяцінстве.

— Што для вас цуд, і каму вы гатовы зрабіць цуд?

— Адразу пасля Новага года дрэў мы не расслабляемся. Бо праз месяц у нас іншае свята — Пурым, дзе нам дазволена напіцца, адзін раз на год (аднак ніхто занадта не карыстаецца гэтай прапановай). Напіцца з адной умовай: каб не адрозніць Мардахея, які ратаваў наш народ, ад Амана, які хацеў яго знішчыць. Мы паспрабуем паглядзець, што ёсць добра і што ёсць зло праз іншае бачанне. Вельмі важна перачытаць кнігу Ясфіры, каб разумець, як мог загінуць народ, як яго выратавалі. У гэты час трэба ўзяць два пачастункі і паслаць камусьці. Засведчыўшы тым самым: ты для мяне важны, я з табой сябрую. Мяркую, гэта важная частка сацыяльнага складніка зносін. Бо мы вельмі моцна сышлі ў сацсеткі, у іншыя інтэрнэт-рэсурсы. Таму гэты звычай старадаўні і ў той жа час вельмі сучасны. І тут не прысутнічае прынцып абавязковай узаемнасці, усё ідзе спантанна. Таксама ты павінен знайсці двух чалавек, якім горш, чым табе, і даць ім падарункі. Мы ў цэнтры вырашылі збіраць грошы і цацкі і адпраўляць у дзіцячы дом у Барысаве. Для мяне гэта і ёсць цуд, для іншага і для сябе таксама.

— Другі яўрэйскі Новы год будзе святкавацца ў верасні?

— Так, час яго крыху мяняецца, сёлета — 30 верасня. Мы ядзім яблыкі з мёдам. Яблык — каб год быў моцны. Мёд — каб ён быў салодкі. Мы спалучаем моц і салодкасць. Бо калі год толькі моцны, фінансава стабільны, але ў ім няма ніякага агеньчыку, то гэта крыху сумна. А калі мора агеньчыкаў, але няма чаго паставіць на стол — таксама не вельмі. Такое спалучэнне яблыка і мёду — гэта яшчэ і спалучэнне таго, чаго мы чакаем. Пажаданні на гэта свята ў нас таксама вельмі цікавыя. Першае — каб тваё імя было запісана ў кнізе Жыцця. Другое — каб ты быў у галаве, а ў не хвасце. Плесціся ў хвасце вельмі зручна, а вось галавою трэба думаць. Затое галава заўсёды ўверсе, а хвост не.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.
Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Экспазіцыя

КАДРЫ З ЖЫЦЦЯ

Стваральнікі фальклорнага праекта «Жывая класіка», якія ўжо не адзін месяц калясяць з экспедыцыямі па роднай краіне, каб потым паказаць унікальныя нематэрыяльныя каштоўнасці гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі ў тэлевізійным эфіры на «Беларусь 3», зладзілі сустрэчу з гледачамі.

Вядучая Кацярына Ваданосава, прадзюсар і рэжысёр, іншыя ўдзельнікі здымачнай групы не толькі адказалі на пытанні гасцей імпрэзы, падзяліліся вопытам работы з носьбітамі аўтэнтычных беларускіх традыцый і рамёстваў, але таксама і расказалі багата гісторый пра тое, што звычайна застаецца па-за кадрам праграмы: напрыклад, расказалі, як пазнаёміліся з сапраўднымі шапаваламі і іх асаблівай тайнай мовай «катрушніцкі лемезень», у якой з беларускіх вёсак жывуць нашчадкі шведаў, дзе знаходзіцца «душа» ў клёцках...

Разынкай вечара стала адмысловая выстаўка, падрыхтаваная... гукарэжысёрам праграмы. Ілья Хмяльніцкі падчас шматлікіх творчых камандзіровак часта здымаў на мабільную камеру элементы дэкору і побыт вяскоўцаў. Калекцыя атрымалася настолькі цікавая і нетрывіяльная, што ўжо скарыстоўваецца як дадатковае аздабленне ў тэлепраекце «Жывая класіка», а з 10 студзеня да 10 лютага падборка найлепшых кадраў будзе адкрытая для

ўсіх ахвотных у сталічнай бібліятэцы імя Янкі Купалы. Таксама прыемнымі сюрпрызамі вечара сталі выступленні навучэнцаў гімназіі-каледжа пры Беларускай акадэміі музыкі і ўласна Кацярыны Ваданосавай — як паэткі і ўдзельніцы музычнага гурта Kaciaryna Vadanosava & Fantasy Orchestra.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Замест кантэйнераў для смецця — спецмашына

З вёскі Іканы Барысаўскага раёна патэлефанавала Таісія Пятроўна Салсанава, потым размова працягнулася з яе дачкой. Сутнасць звароту жанчын была ў наступным: паводле іх слоў, недзе з восені з вуліц вёскі прыбралі металічныя кантэйнеры для цвёрдых бытавых адходаў, і з таго часу стала праблематычна выкінуць смецце. Не, выкінуць на ранейшае месца, дзе яшчэ нядаўна стаялі тыя металічныя скрыні, пакеты з бытавымі адходамі можна, але ж жанчыны слушна заўважаюць, што іх парвуць сабакі, параскідаюць-парасцягваюць смецце па вуліцы.

— Раней гэтыя кантэйнеры стаялі ў канцы нашай вуліцы, іншых, каля крамы. Было зручна. Цяпер жа даводзіцца прасіць знаёмых, якія едуць у горад, прыхапіць нашы пакеты са смеццем і выкінуць іх там у якую урну, — даводзілі нам заяўніцы.

Трэба заўважыць, што яны пастаянна ў вёсцы не пражываюць, апошні раз прыехалі ў канцы снежня. Але сцвярджаюць, што смецце ад насельніцтва ніхто не вывозіць прыцяглы час, недзе з той самай восені, прынамсі, ніякіх спецмашын жанчыны пэўны час у населеным пункце не бачылі, хоць грошы за паслугу бяруць. Як іншыя вяскоўцы вырашаюць праблему з вывазам бытавых адходаў, яны не ведаюць.

А справа ў тым, што ў суседзяў і знаёмых заяўніц іх як вывозілі, так і працягваюць вывозіць.

— Сапраўды, у населеных пунктах усяго Барысаўскага раёна металічныя кантэйнеры для цвёрдых бытавых адходаў зніклі — недзе, як гавораць вашы заяўніцы, з восені, — расказала нам у тэлефоннай гутарцы старшыня Іканаўскага сельскага Савета Ганна Картасава. — Па-першае, зноў жа, як слушна заўважылі жанчыны, гэта антысанітарыя, пах, смецце, якое разлятаецца па наваколлі ад ветру, птушак і жывёл. Па-другое, нам прапанавалі, апроч таго, што само насельніцтва аплачвае вываз смецця, яшчэ дадаткова плаціць за ўстаноўленыя кантэйнеры для цвёрдых бытавых адходаў. А вы ж ведаеце, які бюджэт у сельскага Савета!

Таму зараз па населеных пунктах раз на тыдзень (апроч аднаго на 800 домаўладанняў, там часцей) ездзіць спецыяльная машына для збору бытавых адходаў — з задняй загрузкай. Абслугоўваюць яе кіроўца і яшчэ адзін работнік, які, як заўважыла старшыня сельскага Савета, «калі што, і падмесці можа, калі смецце рассыпалася». Ранейшыя кантэйнеры для цвёрдых бытавых адходаў пакінулі толькі на могілках.

— Я заўсёды кажу жыхарам, каб тэлефанавалі мне, калі з нейкай прычыны машына да іх не дайшла і смецце не забралі. І работнікам на ёй наказваю, каб наступным разам абавязкова пад'ехалі да домаўладання, да якога не змаглі дабрацца мінулы раз. Такое здараецца вельмі рэдка, — гаворыць Ганна Міхайлаўна. — Зараз вось, напрыклад, наваліла снегу, бывае, машыне цяжка развярнуцца. Так што калі і ёсць пропуск, дык не больш аднаго тыдня. А смецце вяскоўцам трэба выносіць на вуліцу насупраць свайго дома — спецмашына праязджае па ўсёй вуліцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Грodненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 412/С-23336 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 126,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, пер. Пушкина

Лот № 1 расположен на земельных участках, кадастровый номер 424050100015000123 (назначение – земельный участок для размещения объектов неустановленного назначения (эксплуатация и обслуживание строений)), площадью 0,0052 га, расположенном по адресу: г. Мосты, пер. Пушкина, и кадастровый номер 424050100015000137 (назначение – для обслуживания здания магазина), площадью 0,0121 га, расположенном по адресу: г. Мосты, пер. Пушкина

Начальная цена продажи – 5 300 руб. (пять тысяч триста рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 530 руб. (пятьсот тридцать рублей)

Продавец – Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 31 января 2019 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.08.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 28 января 2019 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Лот 1: капитальное строение, инв. № 412/С-9025 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – одноэтажное кирпичное здание магазина), площадью 329,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1; капитальное строение, инв. № 412/С-26562 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – наружная канализационная сеть магазина), протяженностью 23,7 м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1, наружная канализационная сеть магазина; капитальное строение, инв. № 412/С-26561 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – наружная водопроводная сеть), протяженностью 113,0 м, расположенное по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1, наружная водопроводная сеть магазина

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 424050100016000024 (назначение – обслуживание здания магазина), площадью 0,0594 га, расположенном по адресу: г. Мосты, ул. Пролетарская, 1

Начальная цена продажи – 56 000 руб. (пятьдесят шесть тысяч рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 5 600 руб. (пять тысяч шестьсот рублей)

Продавец – Мостовский филиал Гроднооблпотребобщества, 231600, г. Мосты, ул. 30 лет ВЛКСМ, 1, тел./факс 8-01515-325-22

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.
Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 31 января 2019 г. в 12.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.
При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.
В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 24.11.2018 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 28 января 2019 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by

Zамор'е

Урачы выратавалі пацыента півам

У В'етнаме медыцынскія работнікі выратавалі пацыента ад смерці ад алкагольнага атручвання, уліўшы ў яго 4,5 літра піва, паведамляе выданне Daily Mail.

Інцыдэнт адбыўся ў адной з бальніц правінцыі Куангчы. Паводле слоў кіраўніка аддзялення рэанімацыі доктара Ле Ван Лама, хуткая дапамога даставіла 48-гадовага Нгуена Ван Нхата ў бальніцу ў цяжкім стане. Узровень метанолу ў яго крыві перавышаў норму ў 1119 разоў з-за таго, што ён выпіў шмат няякаснага алкаголю. Доктары прынялі рашэнне ўліць у арганізм мужчыны тры банкі піва па 0,3 літра, бо яно ўтрымлівае ў ім этанол, антыдот метанолу. Гэта дапамагло, таму на працягу наступных 12 гадзін пацыенту давалі яшчэ па бляшанцы ў гадзіну. Увесь гэты час урачы праводзілі гемадыяліз — ачыстку крыві ад смяротна небяспечных таксінаў. У выніку працэдур Нхат прыйшоў у прытомнасць. Праз тры тыдні ён цалкам ачуняў і выпісаўся з бальніцы.

Доктар Лам патлумачыў, што алкаголь можа паступіць у арганізм чалавека ў двух формах — этылавы спірт і метылавы спірт. Другі ўяўляе смяротную небяспеку для чалавека з-за таго, што акісляецца да атрутнага фармальдэгіду. Пры паступленні ў арганізм этанолу і метанолу печань аддае прыярытэт апрацоўцы этанолу. Гэтым скарысталіся ўрачы, выбіраючы метад лячэння.

Тых, хто не даядае ў дубайскім рэстаране, аштрафуюць

У Аб'яднаных Арабскіх Эміратах з'явіўся рэстаран, наведвальнікаў якога штрафуюць за недаедзеныя стравы, паведамляе партал Time Out Dubai.

Установа пад назвай Gulou Hotpot размешчана ў Дубаі. Калі кліенты заказваюць хога за 49 дырхамаў (каля 30 рублёў), яны абавязаны даесці ўсё да канца. У булён у кацялку (закіпае прама на стале) можна дадаць неабмежаваную колькасць інгрэдыентаў, сярод якіх локшына, тофу, мяса, морапрадукты і гародніна. На працягу дзвюх гадзін з моманту заказу кліенты могуць бясплатна ўзяць неабмежаваную колькасць напояў. Аднак, калі страва застанецца недаедзенай, наведвальнік будзе абавязаны заплаціць яшчэ 50 дырхамаў. Кіраўніцтва рэстарана тлумачыць, што такім чынам хоча прымусіць кліентаў больш свядома падыходзіць да выбару ежы і скараціць колькасць адходаў.

Японскі гатэль звольніў супрацоўнікаў-робатаў

Сетка гатэляў у Японіі Henn na, укамплектаваная ў асноўным супрацоўнікамі-робатамі, адправіла палову сваіх андроідаў на кансервацыю, піша South China Morning Post.

Прычынай гэтага сталі частыя паломкі, а таксама дарагі кошт абслугоўвання і мадэрнізацыі машын. Але галоўнай прычынай называюць тое, што робаты аказаліся няздольныя паўнавартасна камунікаваць з пастаяльцамі — не маглі адказаць на простыя пытанні, а адзін робат-памочнік у нумары прымаў храп госця за каманду і настойліва прасіў паўтарыць яе. У выніку за стойкай рэгістрацыі замест робатаў устануць «традыцыйныя» людзі. Таксама адкрыты вакансіі прыбіральшчыкаў, насільшчыкаў і іншага абслуговага персаналу. Пры гэтым Henn na не збіраецца адмаўляцца ад тэхнічнага прагрэсу і распрацоўвае новае пакаленне андроідаў-гатэльераў.

Іван КУПАРВАС.

ПУТЧ У «КАПЮШОНЕ»

Чаму неспакойна ў Габоне?

На Каляды ў далёкім Габоне, размешчаным на Атлантычным узбярэжжы Экватарыяльнай Афрыкі, здарыўся ваенны пераварот. А палове пятай па мясцовым часе ў будынак дзяржаўнай радыёкампаніі ўварвалася група ўзброеных вайскоўцаў. Яны запатрабавалі перадаць у эфір падрыхтаванае імі камюніке. Паўстанцамі верхаводзіў лейтэнант Кэлі Онда Абіанг, які займаў пасаду намесніка камандзіра рэспубліканскай гвардыі Габона. Ён зачытаў кароткі зварот ад імя «Патрыятычнага руху моладзі ўзброеных сіл і бяспекі Габона», у якім гаварылася аб расчараванні ў палітыцы дзеючага прэзідэнта Алі Бонга і абвяшчалася стварэнне «Нацыянальнага савета рэстаўрацыі», да якога і павінна была перайсці ўлада ў краіне. Аднак, як неўзабаве стала вядома, сілавыя структуры краіны пераварот не падтрымалі. Таму праз некаторы час верныя прэзідэнту Алі Бонга воінскія падраздзяленні здолелі падавіць мяцеж. Радыё RFI са спасылкай на міністра па справах камунікацый Гі-Бертрана Мапонгу паведаміла, што сілавікі арыштавалі мяцежнікаў. Міністр заявіў, што гаворка ідзе аб групе «жартаўнікоў», невядомых камандаванню арміі. Чаму «ліхаманіць» рэспектабельны па афрыканскіх мерках Габон?

ТРЫ ПРЭЗІДЭНТЫ

Габон знаходзіцца на заходнім узбярэжжы Цэнтральнай Афрыкі і мяжуе з Гвінеяй, Камерунам і Рэспублікай Конга. Гісторыю гэтай дзяржавы можна лічыць тыповай для Чорнага кантынента. Да часу з'яўлення еўрапейцаў у Габоне мясцовае насельніцтва жыло першабытнаабшчынным ладам і не мела нават зародкаў дзяржаўнасці. Першымі сюды дабраліся партугальцы. У 1472 годзе капітан Руй дзі Сікейру выявіў бухту, якую назваў Габон (ад партугальскага слова, якое абазначае плашч з капюшонам). У XVII—XVIII стагоддзях у гэтыя мясціны пачалі прыплываць галандцы, французы, іспанцы, брытанцы. Яны абменьвалі свае тавары (соль, крэмневыя стрэльбы, порах, пацеркі, алкагольныя напоі) на слановую косць, эбенавае дрэва, воск, мёд, пальмавы алей. У прыбярэжных раёнах ствараліся гандлёвыя факторыі і каталіцкія місіі.

У пачатку XVIII стагоддзя на ўзбярэжжы з'явілася каралеўства Арунгу, якое канкуравала гандаль з еўрапейцамі. Яно стала буйным пастаўшчыком рабоў і праіснавала да 1873 года. Сыход Арунгу звязаны з заняпадам гандлю «жывым таварам». Пачатак каланізацыі Францыяй гэтай тэрыторыі паклаў капітан Луі Эдуард Буэ-Вільямэз, які заснаваў у бухце Габон стаянку для караблёў і заключыў у 1839 годзе дамову з правадыром племені мпонгве, якога абярнулі ў хрысціянства. У 1849-м французы захапілі партугальскі карабель гандляроў рабамі і вызваленыя афрыканцы заснавалі паселішча Лібрэвіль — цяперашнюю сталіцу краіны. З сярэдзіны XIX стагоддзя пачалося пранікненне французаў у глыбінныя раёны.

Краіна атрымала незалежнасць у 1960 годзе. За ўсю гісторыю незалежнага Габона ў ім змянілася толькі тры прэзідэнты. Першы быў Леон Мба, пасля яго смерці прэзідэнтам стаў 32-гадовы Альбер-Бернар Бонга (бацька цяперашняга кіраўніка дзяржавы). Сын правадыра племя тэке, ён скончыў лётную школу, два гады праслужыў у ваенна-паветраных сілах, а затым перайшоў на дзяржаўную службу. За чатыры гады колішні капітан авіяцыі зрабіў галавакружную кар'еру, заняўшы спачатку пасаду намесніка кіраўніка адміністрацыі прэзідэнта Леона Мба, затым кіраўніка адміністрацыі, а ў 1964 годзе перамясціўся ў крэсла міністра абароны Габона. У 1966-м Бонга стаў віцэ-прэзідэнтам краіны, а калі 28 лістапада 1967 года памёр Леон Мба, змяніў яго на пасадзе прэзідэнта. У 1973 годзе Альбер-Бернар пабываў з візітам у Лівіі, дзе трапіў пад уплыў Муамара Кадафі і прыняў іслам, адпаведна пераназваўшы сябе ў Эль-Хадж Амара Бонга. Гэта было вельмі дзіўнае рашэнне, улічваючы, што пераважная большасць жыхароў краіны вызнаюць хрысціянства каталіцкага толку, накладзенае на мясцовыя традыцыйныя культы, а мусульман тут нават цяпер не больш за сем працэнтаў насельніцтва. Аднак, нягледзячы на нядрэнныя адносіны з Лівіяй, у цэлым Габон заўсёды праводзіў празаходнюю палітыку і лічыўся адным з апірышчаў французскага ўплыву ў Афрыцы. Французскія дэсантнікі не раз ратавалі Бонга ад пратэстных выступленняў і спроб ваенных пераваротаў. Сам Бонга-старэйшы казаў: Габон без Францыі — як аўтамабіль без кіроўцы. Францыя без Габона — як аўтамабіль без паліва.

ФАНК, МАСОНЫ І ФУТБОЛ

Насамрэч цесныя сувязі з Пятай рэспублікай тлумачыліся тым, што Габон валодае каласальнымі прыроднымі багаццямі — нафтай, марганцам (найбуйнейшае ў свеце радовішча, агульныя запасы якога ацэньваюцца ў 225 мільёнаў тон), прыродным газам, жалезнай рудой, драўнінай, гідрарэсурсамі. Між тым асаблівае значэнне заўсёды надавалася габонскаму ўрану. Габон займае пятае месца ў свеце па запасах урану і меў эксклюзіўныя дамовы з Францыяй аб тым, што будзе пастаўляць уран толькі гэтай краіне. Прыродныя рэсурсы зрабілі Габон адной з найбагацейшых краін афрыканскага кантынента. Аснову экспарту заўсёды складалі нафта і нафтапрадукты (краіна ўваходзіць у АПЕК і лічыцца адной з самых перспектыўных на сусветным рынку вуглевадародаў — аб'ёмы здабычы «чорнага золата» тут дасягаюць 200 тысяч бараляў у дзень), якія пастаўляюцца ў Кітай, Японію, Аўстралію, ЗША, Індыю, Паўднёвую Карэю і шэраг іншых дзяржаў. Імпарт, наадварот, мае пераважна французскае або кітайскае паходжанне. З тых часоў, як краіна атрымала незалежнасць, яна застаецца адной з самых стабільных і заможных на кантыненце. Звыш 80 працэнтаў насельніцтва жыве ў гарадах, што істотна перавышае сярэдні ўзровень урбанізацыі краін Афрыкі на поўдзень ад Сахары, які складае каля 40 працэнтаў.

Дзеючы прэзідэнт Габона 59-гадовы Алі бен Бонга Андзімба атрымаў у спадчыну ўладу ад свайго бацькі Амара Бонга, які ўзначальваў краіну 42 гады. Бонга вядомы не толькі сваімі палітычнымі рашэннямі, але і любоўю да музыкі, футбола і масонскага руху. Сольны музычны альбом будучага прэзідэнта ў стылі фанк, які выйшаў у 1977 годзе, называўся A Brand New Man. Пласцінку прадзюсаваў менеджар легендарнага амерыканскага спевака Джэймса Браўна Чарльз Бобі. Стаўшы палітыкам, Алі таксама дэманстраваў сваю любоў да джаза, басанова і класічнай музыкі. Напрыклад, падчас сваёй прэзідэнцкай кампаніі ў 2009 годзе ён пачаў чытаць рэп.

Праз чатыры гады пасля выхаду музычнага альбома Алі Бонга вырашыў пераключыцца на палітыку. Спачатку ён стаў міністрам замежных спраў, а затым міністрам абароны краіны. У 2009 годзе пасля смерці бацькі Алі выйграў выбары прэзідэнта, атрымаўшы падтрымку 42 працэнтаў насельніцтва. Вядомы сваёй любоўю да футбола, Бонга ў 2015 годзе запрасіў у Габон футбаліста Леанэля Месі. Бонга з'яўляецца адным з нямногіх франкамоўных прэзідэнтаў краін Афрыкі, хто не толькі адкрыта падтрымлівае масонскі рух, але і ўзначальвае ложу ў Габоне.

«ХОПІЦЬ ЕСЦІ І ПІЦЬ!»

Цікава, што спроба ваеннага пераваротаў адбылася якраз у тыя дні, калі дзеючы прэзідэнт Габона знаходзіўся на лячэнні ў Марока. Справа ў тым, што ў кастрычніку 2018-га 59-гадовы Алі Бонга перанёс інсульт. Яго тэрмінова даставілі на самалёце ў Эр-Рыяд, дзе прэзідэнт прайшоў курс тэрапіі, а затым перавезлі на аднаўленчае лячэнне ў Марока. Тым не менш 31 снежня 2018 года Алі Бонга звярнуўся з навагоднім пасланнем да грамадзян краіны. Менавіта гэта пасланне, калі верыць афіцыйнай версіі, і абурыла вайскоўцаў, якія склалі ядро змоўшчыкаў. Нібыта Бонга з цяжкасцю размаўляў, а яго рука вісела як бізун, але пры гэтым прэзідэнт казаў пра сваё добрае самаадчуванне.

Таму змоўшчыкі і вырашылі адхіліць хворага прэзідэнта, каб «аднавіць дэмакратыю» ў Габоне. Кіраўнік путчыстаў арыгінальна заклікаў суграмадзян да зброі: «Хопіць есці, хопіць піць, калі вы зараз ясце і п'яце! Калі спіце, прачніся, будзіце суседзяў — выходзьце ў адзіным парыве і займайце вуліцы! Прыйшоў доўгачаканы дзень, калі войска рашылася ўстаць на бок народа і вывесці Габон з хаосу!» Паўсталыя ваенныя звярнуліся да салдат усіх узброеных сіл і паліцыі з заклікам захапіць аэрапорты, муніцыпальныя ўстановы, сродкі масавай інфармацыі і транспарт.

Калі здароўе Алі Бонга пагоршылася, сітуацыяй у Габоне вельмі моцна зацікавіліся нават не столькі ў Францыі, колькі ў Злучаных Штатах. І гэта невыпадкова. Апошнім часам ЗША імкнуцца актывізаваць свой удзел у палітыцы і эканоміцы Чорнага кантынента. Гэта адбываецца ў сувязі з двума асноўнымі фактарамі. Вашынгтон страчвае цікавасць да Блізкага Усходу, паколькі блізкаўсходнія партнёры ЗША — Турцыя, Сірыя і нават Ізраіль — усяляк паказваюць імкненне дзейнічаць выключна ў сваіх інтарэсах.

Не варта забываць і аб тым, што Кітай і Расія таксама нарошчваюць сваю прысутнасць у Афрыцы, што не можа падабацца амерыканцам, адзначае topwar.ru. Сустрэча Алі Бонга з Уладзімірам Пуціным, якая адбылася летам мінулага года, падчас чэмпіянату свету па футболе, таксама не магла не насцярожыць Вашынгтон. «Сёння аб Афрыцы кажуць усё ў самых розных аспектах. Гэты кантынент мае найбагацейшыя рэсурсы, і зараз мы назіраем, як многія буйныя дзяржавы змагаюцца паміж сабой, каб атрымаць доступ да гэтых надзвычай багатых рэсурсаў», — сказаў тады габонскі прэзідэнт. У той жа час у Маскве пабываў і прэзідэнт Судана Амар аль-Башыр. Абодва гэтыя палітыкі заклікаюць да актывізацыі расійскага ўплыву ў Афрыцы і падтрымліваюць сяброўства з Пекінам.

АБМЕЖАВАНЫ КАНТЫНГЕНТ

2 студзеня 2019 года ў Габон былі перакінутыя амерыканскія войскі. Ужо 5 студзеня прэзідэнт ЗША Дональд Трамп паведаміў Кангрэсу ЗША аб адпраўцы ў Афрыку вайсковага кантынгенту. Пры падтрымцы авіяцыі ў Габон былі перакінуты каля 80 амерыканскіх вайскоўцаў. Колькасць быццам бы невялікая, але ж гэта толькі пробны рэйд, пасля якога ў Габон могуць прыбыць і больш вялізныя сілы. Фармальна прыбыццё амерыканскага кантынгенту тлумачыцца нестабільнасцю ў суседняй Дэмакратычнай Рэспубліцы Конга. Але грамадзянская вайна ў Конга ідзе ўжо не адно дзесяцігоддзе. Пікантнасці сітуацыі надае той факт, што ДРК не мае мяжы з Габонам — іх падзяляе тэрыторыя Рэспублікі Конга.

Цікава і тое, што перш «манаполіяй» на сілавыя дзеянні ў сваіх былых калоніях валодала Францыя. Калі ў афрыканскіх краінах, якія калісьці ўваходзілі ў склад Французскай каланіяльнай імперыі, адбываліся нейкія ваенныя або палітычныя падзеі, якія пагражалі б інтарэсам Францыі і Захаду ў цэлым, то туды адпраўляліся менавіта французскія войскі. Уласна для гэтай мэты Пятая рэспубліка дагэтуль трымае ў Афрыцы вялікія вайсковыя базы і падраздзяленні Замежнага легіёна. Калі ўспомніць гісторыю, то французскія ваенныя неаднаразова ўмешваліся ў палітычныя падзеі ў Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы, Малі, на Каморскіх астравах, ды і ў тым жа Габоне.

Мяркуючы па ўсім, у Вашынгтоне ўсур'ёз затурбаваліся аб далейшым лёсе палітычнага ладу Габона. «Аддаваць, выпускаць такую краіну амерыканцам проста нельга», — заўважыў vz.ru кіраўнік Цэнтра даследавання расійска-афрыканскіх адносін і знешняй палітыкі краін Афрыкі Інстытута Афрыкі РАН Яўген Карандзясаў. Цікава, што Трамп, адпраўляючы войскі, нават не знайшоў час паведаміць пра тэрміны знаходжання амерыканскага кантынгенту ў гэтай краіне. Ён толькі абмежаваўся агульнымі фразамі, што ЗША захавае ваенную прысутнасць у рэгіёне да таго часу, пакуль гэта, маўляў, будзе патрэбна для абароны амерыканскіх грамадзян. Трамп адзначыў, што ў залежнасці ад абставін кантынгент можа быць павялічаны. Гэта значыць, фактычна ўвод войскаў можа быць і бестэрміновым, у залежнасці ад таго, якім чынам Вашынгтон плануе далейшае развіццё падзей. Ёсць версія і пра тое, што спроба пераваротаў была справакаваная якраз амерыканскім бокам, паколькі змоўшчыкі спадзяваліся на яго падтрымку. У любым выпадку відавочна, заўважаюць эксперты, што ўжо ў самай агляднай будучыні ў гэтым стратэгічным рэгіёне Афрыкі могуць адбыцца маштабныя палітычныя перамены.

Захар БУРАК.

КАРАЛЕВА РЫЗЫКІ

Кім будзе прадстаўлена акрабатыка на Еўрапейскіх гульнях

Адным з самых прыгожых відаў спорту, які ўключаны ў праграму II Еўрапейскіх гульняў, стане спартыўная акрабатыка. Турнір пройдзе на «Мінск-Арэне», гэтую пляцоўку акрабаты будуць дзяліць з мастацкімі гімнастамі. Па восем найлепшых пар і трыа з Еўропы разыграюць шэсць камплектаў узнагарод. Каб расказаць чытачам, як беларуская каманда рыхтуецца да аднаго з самых адказных турніраў года, карэспандэнты «Звязды» зазірнулі на трэніроўку зборнай.

* * *

Сёння нацыянальная каманда па спартыўнай акрабатыцы складаецца з 13 спартсменаў і 5 трэнераў. З іх на Еўрапейскія гульні ў Мінску рыхтуюцца тройка і дзве змешаныя пары. Дарэчы, наша трыа ў складзе Карыны Сандовіч, Веранікі Набокінай і Кацярыны Барысевіч ужо выступалі на Еўрапейскіх гульнях у Баку і занялі там трэцяе месца. Зараз тройка зведала змены, па сямейных абставінах каманду пакінула Кацярына Барысевіч, яе змяніла Юлія Івончык. *«Дзяўчаты ўжо дастаткова вопытныя, іх трыа можна назваць тытулаваным,* — расказвае **старшы трэнер, начальнік каманды Ірына ЛЯСЬКО.** — *Яны паказваюць складаную праграму, адпрацаваную, узровень артыстызму таксама на вышыні».*

Са змешанымі парамі справы ідуць пакуль не так ясна. На права прадстаўляць краіну на дамашніх Еўрапейскіх гульнях прэтэндуюць два дуэты — Канстанцін Яўстаф'еў і Ганна Касьян з Мінска, а таксама Вольга Мельнік (Брэст) і Артур Белякоў (Гомель). Для гэтых акрабатаў трэба будзе прайсці два этапы адбору — этапы Кубка свету ў сакавіку, па выніках якіх стане ясна, хто выступіць на Гульнях у чэрвені. *«Гэта добрая канкурэнцыя ўнутры каманды, дзве пары ідуць нага ў нагу. Спартсмены таксама вопытныя — прызёры чэмпіянатаў свету і Еўропы»,* — адзначае Ірына Лесько.

Наогул, на Еўрапейскіх гульнях у Мінску будуць выступаць восем змешаных пар і восем трыа. Гэта найлепшыя прадстаўнікі краін, якія адабраліся па выніках чэмпіянату свету 2018 года.

Задачы на Еўрапейскія гульні ў зборнай Беларусі вельмі высокія — два медал. *«Наш від спорту не алімпійскі, таму задачы на любыя спаборніцтвы для нас — гэта 1—3 месца, трымаць планку высока даводзіцца заўсёды»,* — падкрэслівае старшы трэнер каманды. Традыцыйна галоўнымі канкурэнтамі ў барацьбе за медалі для беларусаў і на Еўрапейскіх гульнях стануць расійскія спартсмены.

У рамках падрыхтоўкі да Гульняў зборная Беларусі выступіць на этапах Кубка свету ў сакавіку. У красавіку каманда будзе праходзіць падрыхтоўку да тэставых спаборніцтваў, якія з 1 да 5 мая прыме «Мінск-Арэна». Беларускі бок плануе разаслаць запрашэнні на турнір усім удзельнікам Еўрапейскіх гульняў. *«Для нас тэставыя спаборніцтвы будуць вельмі важныя, яны пройдуць па фармаце будучых Гульняў,* — расказвае Ірына Лясько. — *Мы яшчэ ні разу не выступалі на «Мінск-Арэне», таму абавязкова трэба пратэсціраваць пляцоўку. І тэставыя спаборніцтвы, і спаборніцтвы Еўрапейскіх гульняў у нас будуць праходзіць паралельна з мастацкай гімнастыкай, яны, у адрозненне ад нас, ужо праводзілі на арэне чэмпіянат Еўропы, таму маюць куды больш вопыту і дапамагаюць нам у арганізацыі. Мы купляем новае абсталяванне, яго трэба ўсталяваць, пакласці дыван, уладкаваць разміначныя і трэніровачныя залы. Тэставыя турніры таксама важныя не толькі для саміх спартсменаў, але і для арганізацыйнага камітэта, каб і валанцёры, і ўвесь персанал, які будзе абслугоўваць спаборніцтвы, змог аператыўна працаваць на Еўрапейскіх гульнях».*

* * *

Акрабатыка — від спорту суб'ектыўны, бо ацэньваюць атлетаў жывыя людзі. Ацэнка спартсмена складваецца з тэхнічнай складанасці і артыстызму. Кожная праграма павінна ўтрымліваць восем элементаў, гэта значыць, пірамід, у якіх спартсмены стараюцца набраць максімальную складанасць, а яна, дарэчы, у акрабатыцы не абмежавана. Выступленні спартсменаў складваюцца з трох практыкаванняў: дынамічнага (сальта і вінтавыя скачкі), балансавага (статычныя практыкаванні) і камбінаванага. *«Нават адна дзясятая можа адыграць вялікую ролю, мы часта сутыкаемся з несправядлівасцю ў адносінах да ацэнак спартсменаў, таму важна, каб у судзейскім корпусе былі прадстаўнікі кожнай краіны. Па міжнародных правілах, калі краіна не падае на спаборніцтвы суддзю, то павінна заплаціць штраф»,* — тлумачыць Ірына Лясько.

Каб аказацца на п'едэстале самых прэстыжных спаборніцтваў, акрабатам неабходна валодаць не толькі добрай тэхнічнай базай, але і прафесійным артыстызмам. Трэнеры нашай зборнай адзначаюць, што калі да тэхнікі беларускіх спартсменаў нараканняў практычна няма, то вось над артыстызмам працы яшчэ шмат. Таму сёлета ў штабе зборнай з'явіўся **трэнер-харэограф — Вольга ВАШЧАНКА.**

«Для акрабатыкі вельмі важна харэаграфія — адзін з аспектаў выступлення. Гэтак жа, як мы змагаемся за адзнаку па тэхніцы, змагаемся і за адзнаку па артыстызме, — расказвае харэограф Вольга Аляксандраўна. — *Нам заўсёды ёсць да чаго імкнуцца, вядучыя краіны задаюць узровень харэаграфіі. У такіх краін, як Бельгія, Англія, Ізраіль, вельмі высокі ўзровень артыстызму, яны заўсёды з'яўляюцца наватарамі ў харэаграфіі, пастаянна прыдумваюць нешта новае і цікавае. Нам на дадзены момант трэба імкнуцца павысіць свой узровень, каб не адставаць ад вядучых краін, і нараўне з тэхнічнай ацэнкай атрымліваць адзнаку па харэаграфіі».*

Час, за які атрымліваецца паставіць праграму, залежыць ад майстэрства спартсмена, узроўню яго падрыхтоўкі, ад таго, наколькі зладжана працуюць трэнер і спартсмен. *«Цяпер вось прыехала пара з Гомеля, атрымалася, што мы за два дні склалі кампазіцыю, а бывае, доўга не ладзіцца»,* — адзначае харэограф.

На Еўрапейскіх гульнях нашы спартсмены выступяць з кампазіцыямі, якія ўжо паказвалі суддзям і гледачам, бо для паспяховага выступлення кампазіцыю трэба добра адпрацаваць. Хоць і ў чэрвені аматары спорту змогуць убачыць навінкі ў выступленнях нашых спартсменаў.

Назіраючы за праграмамі акрабатаў, немагчыма не адзначыць іх яркія касцюмы. Дарэчы, эскізы адзення для выступленняў спартсмены распрацоўваюць самі. Швачкі могуць толькі ўнесці дапаўненні. Звычайна нашым спартсменам патрабуецца адзін касцюм на сезон. Чакаць запаветны купальнік даводзіцца не менш за месяц.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Каментарыі:

Карына САНДОВІЧ, бронзавы прызёр I Еўрапейскіх гульняў:

— Уражанні ад I Еўрапейскіх гульняў засталіся, вядома, самыя найлепшыя, такі досвед у жыцці застанецца назаўсёды. Гэтыя спаборніцтвы былі для нас самыя важныя, як Алімпійскія гульні для неалімпійскага віду спорту. Думаю, гэты досвед спатрэбіцца нам і цяпер, у чэрвені, мы ўжо прыкладна ведаем, чаго чакаць, як усё будзе праходзіць. Гэта дазваляе рыхтавацца да выступлення спакойна.

Цяпер мы працуем над сваёй праграмай, ускладняем элементы, чысцім кампазіцыі, стараемся зрабіць усё для таго, каб годна прадставіць сваю краіну на Гульнях 2019 года. З намі працуе наш трэнер Наталля Іванаўна Іваноўская, якая падрыхтавала нямала паспяховых спартсменаў, таму мы вельмі давяраем гэтаму спецыялісту. З харэографам Вольгай Аляксандраўнай працуем над тым, каб нашы кампазіцыі змаглі зачапіць гледачоў і суддзі ацанілі іх па заслугах. II Еўрапейскія гульні стануць самымі важнымі спаборніцтвамі ў маёй спартыўнай кар'еры. Задача адна — залаты медаль, бо мы ведаем, што здольныя на гэта. Трэба ліквідаваць хваляванне і зрабіць сваю работу так, як мы ўмеем, а далей суддзі ўсё вырашаць.

Вераніка НАБОКІНА, бронзавы прызёр I Еўрапейскіх гульняў:

— Еўрапейскія гульні — зусім іншы ўзровень спаборніцтваў. У Баку ў 2015 годзе гэты турнір быў для нас першы, дзе адначасова ўдзельнічала столькі відаў спорту. Уразіў узровень арганізацыі і сама алімпійская вёска. Гэта бясцэнны вопыт, які спатрэбіцца нам і на II Еўрапейскіх гульнях. Зараз наша падрыхтоўка да Гульняў праходзіць старанна, у прынцыпе, як і да ўсіх спаборніцтваў высокага ўзроўню. Еўрапейскія гульні вельмі важная для нас падзея, задача — зрабіць сваю работу, як мага лепш, каб мы і наш трэнер быў задаволены.

Экспрэс-навіны

Квіткі на Гульні ў Токіа-2020 могуць паступіць у продаж у канцы красавіка

Дату плануюць прымеркаваць да нацыянальных святаў. Летась арганізатары абвясцілі, што плануюць пачаць рэалізоўваць квіткі вясной. Цяпер чакаецца, што продажы пачнуцца ў канцы красавіка, аднак канчатковыя дамоўленасці яшчэ не дасягнуты.

Як сцвярджаецца, арганізатары спадзяюцца рэалізоўваць білетную праграму падчас свята «Залаты тыдзень» у Японіі, які праходзіць у канцы красавіка — пачатку мая.

Аргкамітэт абвясціў агульны цэнавы дыяпазон для кожнага асобнага віду спорту ў ліпені мінулага года. Адзіным плацежным брэндам стане Visa. Закон, які забараняе перапродаж білетаў з мэтай атрымання прыбытку, павінен набыць моц да пачатку Гульняў.

Мілан і Стакгольм прадставілі заяўкі на правядзенне Алімпіяды 2026 года

Старшыня ацэначнай камісіі МАК зімовых Алімпійскіх гульняў 2026 года Актавіян Марарыў упэўнены: «Маючы такіх кандыдатаў, мы бачым станоўчы ўплыў рэформаў Алімпійскай павесткі 2020 года. Абедзве краіны маюць вялікі вопыт у арганізацыі кубкаў і чэмпіянатаў свету, інфраструктуру і дасведчаных супрацоўнікаў. Гэта дазволіла кандыдатам скараціць неабходныя інвестыцыі і павысіць устойлівасць сваіх праграм».

У сярэднім гарады-кандыдаты на правядзенне Алімпійскіх гульняў 2026 года будуць выкарыстоўваць 80 % ужо існуючых або часовых аб'ектаў у параўнанні з 60 % сярод кандыдатаў на зімовыя Алімпійскія гульні 2018 і 2022 гадоў. Акрамя таго, першапачатковыя эксплуатацыйныя выдаткі, разлічаныя гарадамі-кандыдатамі, у сярэднім на 20 % (каля 400 мільёнаў долараў ЗША) ніжэйшыя, чым выдаткі на папярэднія Гульні.

Гульні ў Рыа прынеслі краіне вялікую эканамічную выгаду

Нядаўняе даследаванне Бразільскага інстытута прыкладных эканамічных даследаванняў паказала, што Алімпійскія гульні ў Рыа-дэ-Жанейра 2016 года аказалі станоўчае эканамічнае ўздзеянне не толькі на горад, але і на ўсю агламерацыю.

Даследаванні паказалі, што без правядзення Алімпіяды валавы ўнутраны прадукт Рыа-дэ-Жанейра на душу насельніцтва быў бы на 7,5 працэнта ніжэйшы ў перыяд да правядзення мерапрыемства (2012—2015 гады) і на 5,1 працэнта ніжэйшы ў агламерацыі.

Паводле вынікаў даследавання, «ва ўмовах інтэнсіўнага крызісу на нацыянальным макраэканамічным узроўні Алімпійскія гульні паспрыялі стрымліванню крызісу ў Рыа-дэ-Жанейра. Нашы высновы паказваюць на станоўчы, нарастаючы і значны па сваіх маштабах эфект на працягу ўсяго гэтага перыяду».

Іншае даследаванне IPEA, апублікаванае ў 2017 годзе, паказала, што ў перыяд падрыхтоўкі і правядзення Гульняў эканамічная актыўнасць узрастала. Было ўстаноўлена, што працэнт насельніцтва без аплачанай працы ў Рыа-дэ-Жанейра знізіўся з 8,1 у пачатку 2012 года да 4,2 у сярэдзіне 2015-га. Наступствы рэцэсіі сталі адчувацца, калі працэнт падняўся з 7,9 да 8,3 па ўсёй краіне.

«Біцца дзеля грошай нецікава»

Сяміразовы чэмпіён свету па тайскім боксе расказаў пра ганарары, сваю адукацыю і жонку-баксёрку

Дзмітрый ВАЛЕНТ у боксе ўжо больш за дзесяць гадоў, яго тытулы па выступленнях у прафесійным і аматарскім спорце вылічаюцца таксама дзясяткамі. Матывацыю быць найлепшым Дзмітрый атрымаў яшчэ ў дзяцінстве, пражыўшы ў адным з самых неспакойных раёнаў сталіцы. Пра тое, як загартоўваў характар на аўтазаводзе, пра жонку, якая таксама займаецца тайскім боксам, і нядаўні байцоўскі турнір «Ахмат», які прыняў Мінск, Дзмітрый расказаў у інтэрв'ю «Звяздзе».

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

«ММА вельмі папулярны ў свеце, у нас цікавасць таксама ёсць»

— Дзмітрый, давайце пачнём менавіта з турніру, які ў канцы 2018 года прайшоў у Мінску.

— Мы даўно не прымалі турніраў такога маштабу, як «Ахмат». Для мяне асабіста было хвалюючa, яшчэ і таму, што я даўно не ўдзельнічаў у такіх мерапрыемствах на прафесійным рынгу дома. Хвалюючa, калі за цябе прыходзяць «хварэць» блізкія, сябры і проста землякі. Заўсёды дома біцца цяжэй, чым за мяжой. Там прыехаў, цябе ніхто не ведае, выйшаў, зрабіў сваю працу, а тут адказнасць, хочацца выйграць абавязкова, каб публіцы спадабалася, каб трэнера не падвесці. Усё ў комплексе дае вялікі груз адказнасці, ты стараешся з ім справіцца, каб гэта не паўплывала на вынік.

У цэлым лічу, што турнір у Беларусі прайшоў на высокім узроўні і баі атрымаліся відовішчныя. ММА вельмі папулярны ў свеце, на баі збіраюцца статысячныя стадыёны. У нас, вядома, пакуль такога няма, але цікавасць таксама вялікая. Наколькі я ведаю, у «Мінск-Арэне» тым вечарам сабралася каля пяці тысяч чалавек. Нядрэнна. Улічваючы, што рэкламавалі «Ахмат» у Мінску не вельмі шмат.

— Ваш бой з украінцам Сяргеем Сніцюком атрымаўся, мабыць, самы відовішчны і цікавы для беларускіх балельшчыкаў.

— Даведаўся імя свайго саперніка за месяц да турніру, тады і пачаў падрыхтоўку. Раней з Сяргеем мы на рынгу не сустракаліся. У Мінску я выйграў паядынак накаўтам, для любога спартсмена гэта важна, ды і трэнер застаўся задаволены маімі дзеяннямі. Лічу, што паказаў відовішчны бой, потым яго нават сам пераглядаў, хоць звычайна свае баі не асабліва люблю глядзець.

— Па колькасці людзей на «Мінск-Арэне» і іх эмоцыях было зразумела, што беларусам падабаюцца такія турніры. Чаму ў нашай краіне яны настолькі рэдкія?

— Для такіх мерапрыемстваў патрэбны вельмі вялікія грошы, Міністэрства спорту іх фінансаваць не можа, бо гэта прафесійны спорт, значыць, патрэбны спонсары, а ў нас у краіне іх знайсці вельмі складана.

«Я гатовы да таго, што паражэнне можа здарыцца»

— Зараз вы выступаеце і ў прафесійных, і ў аматарскіх рынгах?

— Так, я з'яўляюся членам зборнай Беларусі па тайскім боксе, але ў той жа час выступаю і па профі. Аднак сярод прафесіяналаў у мяне даволі спецыфічная вага, прамежкавая, таму не заўсёды атрымліваецца знайсці сабе баі. За два апошнія гады правёў усяго тры прафесійныя паядынкі.

— Вядома, што спартсмены ў вашым відзе зарабляюць добрыя грошы. Які максімальны ганарар можна атрымаць у прафесійным тайскім боксе?

— Гэта залежыць ад імя спартсмена, ад яго вядомасці і заслуг, наколькі бяспройгрышна ён ідзе па сваёй кар'еры. Так, наўскідку скажаць цяжка, але ганарары часам дахо-дзяць да вельмі добрых грошай.

— Тысячы долараў?

— Ды і больш.

— Вы лічыце свае тытулы?

— Прафесійныя даўно не лічыў, па аматарах я сяміразовы чэмпіён свету па тайскім боксе, шэсць разоў выйграў чэмпіянат Еўропы. Браў Кубак свету па кікбоксінгу і выйграваў чэмпіянаты свету і Еўропы. Лічыцца, што для тайскага бокса я пачаў кар'еру даволі позна — у 16 гадоў, але ў мяне ўжо была база: да гэтага я займаўся тэквандо. Падобны від спорту, ногі задзейнічаны, адпаведна цела падрыхтавана. У 17 паехаў на чэмпіянат свету сярод моладзі і заняў там першае месца, літаральна за год заняткаў. Па прафесіяналах свой першы бой выйграў у 19 гадоў, тады біўся з узроставым спартсменам, якому на той момант было ўжо за 30, і атрымаў перамогу накаўтам у першым раўндзе.

— Прыгадваючы папярэднія баі, ці можаце вылучыць самы важны і складаны для вас тытул?

— Што датычыцца аматараў, то, напэўна, гэта самы першы тытул (чэмпіёна свету), хоць я выйграў яго па моладзі. Гэта было першы раз, першы выезд за мяжу, тым больш у Тайланд, на радзіму тайскага бокса. Прыехаў туды, убачыў, як трэніруюцца тайцы, хадзіў з вялікімі вачыма, назіраючы за імі. Пасля турніру мы засталіся на зборы ў маленькай тайскай вёсачцы, дзе мясцовыя рэдка бачылі белых людзей. Пасля гэтай паездкі істотна вырас мой узровень.

Апошнім часам аматарскія спаборніцтвы прыносяць ужо не такія эмоцыі, таму што столькі ўжо выйграна, столькі зроблена. Цяпер хочацца больш рэалізавацца ў прафесійным спорце. Мая мэта — праводзіць максімальную колькасць баёў, заваёўваць тытулы вядучых арганізацый. З менеджарам працуем над гэтым.

— Ці лічыце, што пік вашай кар'еры яшчэ наперадзе?

— Думаю, так. Мне 30 гадоў, для нашага віду спорту гэта добры ўзрост, калі ты стаў мужчынам, дастаткова сілы і вопыту за спінай. Пакуль ёсць жаданне і здароўе, буду займацца боксам, калі жаданне знікае, хоць і здароўе ёсць, біцца ўжо няма сэнсу. Ты не зможаш сябе матываваць, а выступаць дзеля грошай нецікава. Шмат прыкладаў, калі жаданне зарабіць прыносіць сумны вынік.

— Памятаеце свой самы складаны бой?

— Так, гэта было ў 2016 годзе, я тады датэрмінова прайграў у першым раўндзе. Біўся супраць вопытнага і тытулаванага спартсмена з Украіны Артура Кішэнкі. Гэта адзіны момант у кар'еры, калі я так прайграў. Вельмі перажываў. Хоць, звычайна не вельмі хвалююся, разумею, што гэта спорт, і калі я ўжо займаюся на такім узроўні, то гатовы да таго, што паражэнне можа здарыцца. Пасля правалу карысна тыдзень адпачыць ад залы, пераключыцца, прыйсці ў патрэбны псіхалагічны стан, пасля гэтага вяртаешся ў залу з новымі сіламі.

«Падчас бою нічога не адчуваю»

— У рынгу вам было калі-небудзь страшна?

— Страх прысутнічае ў любога, няма людзей, якія не баяцца. Як кажуць, не баяцца толькі дурні. Страх павінен быць, гэта рэч, якой трэба ўмець кіраваць і накіроўваць у патрэбнае рэчышча, тады ўсе інстынкты пачынаюць працаваць на карысць (рэакцыя, пачуццё дыстанцыі). Ты ў баі значна мацнейшы, чым на трэніроўцы, таму што за кошт страху, калі правільна яго накіраваць, можаш уключыць свае дадатковыя рэсурсы.

— Чалавек прывыкае да фізічнага болю?

— Падчас бою наогул нічога не адчуваю, хоць мы б'ём адзін аднаго нагамі костка ў костку, трапляем у локці, гэта ўсё адрэналін. Рассячэнне адчуваецца як укол. Боль пачынае адчувацца на наступны дзень.

На шчасце, сур'ёзных траўмаў у мяне не было. Пералом рукі, расцяжэнне звязак, рассячэнне — звыклыя рэчы для нашага віду спорту.

— Што вы адчуваеце, калі б'яце іншага чалавека?

— Я стараюся быць сумленным, зразумела, што гэта спорт, мы абодва выходзім у рынг і хочам выйграць, але зрабіць гэта можа толькі адзін. Таму кожны стараецца рабіць усё магчымае, даводзіцца біць. Але на самай справе я вельмі спакойны чалавек і выхаваны ў тым плане, што не стукну саперніка ў патыліцу або пасля каманды «Стоп». Ёсць шмат брудных байцоў, якія выкарыстоўваюць такія моманты, каб выйграць любой цаной. Я ніколі такога не рабіў.

«У дзяцінстве змяніў пяць школ»

— Вы выраслі ў Мінску ў спальным раёне. Гэта загартавала ваш характар?

— Так, я рос на аўтазаводзе, можна сказаць, на вуліцы з сябрамі. Самі разумееце, як падлеткі ў тыя часы жылі, прысутнічала ўсё. Пэўную загартоўку я атрымаў менавіта там. Адбылося фарміраванне характару, пераадоленне некаторых страхаў.

На самай справе, мне здаецца, я быў, з аднаго боку, дзіцем спакойным, але з іншага — не вельмі. Цяпер ужо вучуся ў 7-й або 8-й установе, а ў дзяцінстве змяніў пяць школ. З-за паводзінаў у мяне не складваліся адносіны з настаўнікамі, часта і не па маёй віне. Лічу, што гэта нармальна, мужчына павінен умець адстойваць свой пункт гледжання, абараніць сябе і сваіх блізкіх.

— У дарослым узросце даводзілася біцца?

— Вельмі даўно, таму што я разумею: могуць быць наступствы. Наш закон кажа пра тое, што калі ты маеш званне, вышэйшае за майстра спорту, і ў бойцы нанясеш чалавеку якія-небудзь калецтвы, будзеш пакараны стражэй, чым просты чалавек. І, наогул, мне гэта не трэба, імкнуся вырашаць усё словамі або проста сыходзіць.

«Жонка слухае толькі мяне і трэнера»

— Ваша жонка Марыя таксама займаецца тайскім боксам...

— Так, нядаўна ў Мексіцы яна заняла трэцяе месца на чэмпіянаце свету. Па сутнасці, мы з ёю праз спорт і пазнаёміліся. Нам было па 17 гадоў, і з таго часу мы разам. Ужо пяць гадоў у шлюбе. Я дапамагаю ёй у падрыхтоўцы. У дзяўчат зусім іншая псіхіка і псіхалогія, яны па-іншаму адчуваюць сябе перад баямі. Яна чуе толькі мяне і свайго трэнера, больш нікога не ўспрымае. У сваю чаргу Маша падтрымлівае мяне, разумее, што такое спорт, як бывае цяжка, калі зганяеш вагу і знаходзішся на мяжы. Думаю, калі б жонка была не са спорту, было б значна цяжэй.

— Вы прысутнічаеце на паядынках адзін аднаго?

— Так, вядома. Калі мы ездзім на чэмпіянаты разам, то я выходжу секундаваць разам з яе трэнерам.

— Цяжка глядзець, як б'юць жонку?

— Цяжка. Я за яе як за блізкага чалавека больш перажываю, чым за сябе. Па-першае, гэта дзяўчына, яна траўміруе твар. Часам нават з'яўляюцца думкі, што я не асабліва хачу, каб яна займалася спортам, але бачу, што Маша атрымлівае ад гэтага задавальненне, даводзіцца падтрымліваць, выйсця няма.

— А Маша як назірае за вашымі баямі?

— Яна нейкім чынам адчувае, калі мне будзе складана, а калі — не, таму нейкія баі глядзіць спакойна, а падчас іншых не можа знайсці сабе месца.

— Яна можа зрабіць вам заўвагі?

— Можа, але я іх асабліва не ўспрымаю, усё ж такі ў мяне заслуг больш, і разбіраюся я ў спорце лепш, але паслухаю, каб ёй было прыемна *(усміхаецца)*.

— Вы атрымліваеце другую вышэйшую адукацыю, прытым яна не спартыўная. Ці плануеце выкарыстоўваць на практыцы?

— Шчыра, пакуль не магу сказаць. У мяне была мэта пайсці адвучыцца, і вось я хутка заканчваю Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце. Далей не ведаю, з чым будзе звязана маё жыццё. Вядома, хацелася б застацца ў спорце, але трэнерская дзейнасць — не надта ўдзячны від працы і дрэнна аплачваецца ў нас у краіне, таму не ведаю.

— Вы неяк казалі, што марыце адкрыць сваю залу...

— Так, але не хачу яе арандаваць, хацелася б выкупіць у кагосьці памяшканне і зрабіць пад сябе. Бо ў Беларусі цяпер вельмі папулярны наш від спорту, больш папулярны, чым класічны бокс або барацьба. Вельмі шмат моладзі трэніруецца, шмат залаў адчыняецца. Гэты кірунак досыць модны, ды і наогул, спорт у апошнія гады стаў вельмі модны, усе пачалі хадзіць у залы, модна мець прыгожае цела. Я лічу, гэта правільна: здаровыя людзі — гэта здаровая нацыя.

Дзмітрый з жонкай Марыяй.

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

Извещение об открытом аукционе по продаже права заключения договора аренды земельного участка для строительства объекта (транспортное кольцо ул. Максима Горького – бульвар Ленинского Комсомола) в городе Гродно 19 февраля 2019 года

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка, (га)	Кадастровый номер	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.	Ориентировочная сумма расходов по подготовке земельно-кадастровой документации, руб.	Условие продажи и целевое назначение земельного участка
1*	Право аренды земельного участка сроком на 50 лет	Район транспортного кольца между зданиями № 78 по ул. Максима Горького и № 4А по бульвару Ленинского Комсомола	0,3835	440100000002007076	209 817,49	40 000,00	5 600,33	Строительство многоквартирного жилого дома повышенной этажности со встроенными нежилыми помещениями

Земельный участок имеет ограничения.

Победитель аукциона обязан:

в установленном порядке получить разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработать строительный проект на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года;

приступить к занятию земельного участка в соответствии с целями и условиями его предоставления не позднее 6 месяцев со дня утверждения проектной документации юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю, 1 года – гражданину;

осуществить строительство объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

В случае нарушения сроков проектирования и строительства в договоре аренды будут предусмотрены штрафные санкции.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

При оформлении заявления лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:

1. Копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении. **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

2. Платеж за право заключения договора аренды земельных участков осуществляется в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона.

3. Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, возместить отделу коммунального имущества и приватизации Гродненского горисполкома расходы по подготовке документации для проведения аукциона.

4. Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектом.

Аукцион состоится 19 февраля 2019 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Заявления на участие в аукционах принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 403, в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. с 21 января по 13 февраля 2019 года**. Телефоны для справок в Гродно: **(0152) 74-20-95, 72-05-37, 72-05-46**. Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

Извещение об открытом аукционе по продаже земельных участков в собственность в г. Гродно (ул. Полевая, микрорайон «Барановичи-5, 6») 19 февраля 2019 года

№ лота	Наименование объекта	Местонахождение объекта	Площадь земельного участка (га)	Кадастровый номер	Ориентировочная стоимость затрат на изготовление документации, руб.	Начальная цена продажи, руб.	Сумма задатка, руб.
1	Земельный участок У-5*	Район улиц Неманской – Петра Милонеги – Полевой	0,1091	440100000002009570	3 424,93	60 810,01	10 000
2	Земельный участок У-348*	Микрорайон «Барановичи – 5, 6»	0,1022	440100000003005266	–	16 577,79	3 300

*Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельный участок имеет ограничения.

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:

внесение платы за земельные участки; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома; занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить не позднее одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома, возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 08.02.2016 № 49 «О некоторых вопросах возмещения затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

Аукцион состоится 19 февраля 2019 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Для участий в аукционе необходимо: внести задаток в размере, указанном в графе 8, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594 получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы:

заявление на участие в аукционе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 403, с 21 января по 13 февраля 2019 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан:

внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись; выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

